Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

5 СТУДЗЕНЯ 2007 г. ПЯТНІЦА
№ 2 (25867)
Кошт 400 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Наша газета ўключана ў «Залаты фонд прэсы» СНД

Пенсійныя «льготы» — за кошт мэтавых узносаў

У Беларусі плануецца ўвядзенне прафесійнага пенсійнага страхавання работнікаў, якія занятыя ў неспрыяльных умовах працы.

У прыватнасці, чакаецца, што фінансаванне пенсійных «ільгот» будзе выведзена з агульнай пенсійнай сістэмы і аплачвацца за кошт іншай крыніцы — мэтавых страхавых узносаў работадаўцаў па накапляльнай схеме. Пры гэтым, як паведаміла начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціна Каралёва, адпаведны законапраект ужо распрацаваны, накіраваны ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і не выключана, што ён будзе разгледжаны на вясновай сесіі парламента.

Апроч таго, адзначыла Валянціна Каралёва, да 2010 года міністэрства мае намер выступіць з прапановай аб пераходзе вылічэння пенсій зыходзячы не з заробку, а з аб'ёму выплачаных узносаў на пенсійнае страхаванне. Такім чынам, з'явіцца магчымасць больш аб'ектыўна ўлічваць уклад кожнага чалавека ў фінансаванне пенсійнай сістэмы. А гэта дазволіць прыйсці да большай дыферэнцыяцыі ў памерах пенсій. Такая дыферэнцыяцыя існуе і зараз. Сёння мінімальная працоўная пенсія ў краіне складае 135 тыс., а максімальная пенсія непрацуючых пенсіянераў — 454 тыс. рублёў. Аднак, заўважыла Валянціна Каралёва, пакуль адрозненні ў памерах выклікаюць шмат незадавальнення, асабліва з боку пенсіянераў, са значным працоўным стажам і вялікім заробкам. Праўда, тут жа варта зрабіць адну істотную агаворку. Паводле слоў Валянціны Каралёвай, новы падыход да разліку пенсій будзе датычыцца толькі будучых пенсіянераў. Пенсіі цяперашнім пенсіянерам працягнуць разлічваць па ранейшых правілах.

Разам з тым у Беларусі не плануецца змянення пенсійнага ўзросту. А таксама (прынамсі, у бліжэйшы час) змены самой пенсійнай сістэмы нашай краіны — з размеркавальнай на накапляльную. Так, зазначыла Валянціна Каралёва, ніхто і нідзе ў свеце пакуль не змог даказаць, што чыстыя накапленні — мадэль ідэальная. Да таго ж не сакрэт: абавязковай умовай накапленняў з'яўляецца высокая ступень развіцця фінансавых рынкаў. У адваротным выпадку накапляльныя пенсійныя сродкі будуць паступова «згараць».

Між тым, зараз у органах па працы і сацыяльнай абароне атрымліваюць пенсіі 2,4 млн чалавек, з якіх 97 працэнтам прызначаюцца працоўныя, а 3 працэнтам — сацыяльныя пенсіі. Пры гэтым за мінулы год сярэдняя пенсія ў Беларусі павялічылася амаль на трэць — з 211 да 277,8 тыс. рублёў. Адначасова рэальныя, з улікам змянення цэн на тавары і паслугі, пенсіі ўзраслі на 119,8 працэнта. І падобная тэндэнцыя павінна захавацца надалей. У прыватнасці, паводле ацэнак міністэрства, да канца 2010 года сярэдняя рэальная пенсія павінна павялічыцца не менш чым у паўтара раза.

Сяргей ГРЫБ.

(Працяг тэмы на 6-й стар.)

ЛІЦЭЙСКАЯ ДРУЖЫНА

Вучні 9—10 класаў мінскага ліцэя № 1 у час зімовых канікулаў не спыняюць трэніровак у басейне сваёй навучальнай установы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ва ўрадзе

Беларусь з 1 студзеня ўвяла мытную пошліну на транспарціроўку нафты

Урад Беларусі прыняў рашэнне аб увядзенні з 1 студзеня 2007 года мытнай пошліны на транспарціроўку нафты па нафтаправодзе, што праходзіць па тэрыторыі Беларусі. Аб гэтым паведаміў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі журналістам у Доме ўрада.

У адпаведнасці з законам Рэспублікі Беларусь аб рэгуляванні знешнеэканамічнай дзейнасці, прынятым у 2004 годзе, Міжведамасная камісія па абаронных мерах у знешнім гандлі і мытнай палітыцы 31 снежня 2006 года ўнесла ў беларускі ўрад прапанову аб увядзенні мытнай пошліны на нафту, што транспартуецца па тэрыторыі Беларусі праз нафтаправоды, якія з'яўляюцца ўласнасцю нашай краіны. Саўмін, разгледзеўшы гэту прапанову, прыняў рашэнне аб увядзенні з 1 студзеня 2007 года мытнай пошліны на транспарціроўку нафты. «Гэта разліковы паказчык, ён разлічваецца зыходзячы з формулы фарміравання сусветнай цаны на нафту», — адзначыў прэм'ер-міністр.

У студзені 2007 года камісія прапанавала ўстанавіць гэты паказчык на ўзроўні $45 за тону нафты, якая транспартуецца праз тэрыторыю Беларусі.

Сяргей Сідорскі паведаміў, што ўрад прыняў адпаведную пастанову і даручыў Міністэрству эканомікі, Дзяржаўнаму мытнаму камітэту ва ўстаноўленым парадку праінфармаваць Мінэканамразвіцця РФ, расійскую кампанію «Транснафта» аб прынятых Беларуссю рашэннях.

Лілія КРАПІВІНА, БЕЛТА.

«Белнафтахім» накіраваў «Транснафце» паведамленне аб увядзенні Беларуссю пошліны на перамяшчэнне нафты

Канцэрн «Белнафтахім» накіраваў афіцыйнае паведамленне расійскай кампаніі «Транснафта» аб увядзенні з 1 студзеня 2007 года пошліны на транспарціроўку нафты праз тэрыторыю Беларусі па магістральных нафтаправодах. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў канцэрне.

Згодна з данымі Мінстата, за студзень—лістапад 2006 года па магістральных трубаправодах Беларусі транспартавана 90,5 млн т нафты, або 93,1 працэнта да ўзроўню адпаведнага перыяду 2005 года.

Мілена АНУФРЫЁНАК, БЕЛТА.

Увядзенне пошліны не накіравана на абмежаванне транзіту нафты праз тэрыторыю Беларусі

Дзеянні беларускага боку ні ў якім разе не накіраваны на абмежаванне транзіту нафты праз тэрыторыю Беларусі. Аб гэтым заявіў прэс-сакратар беларускага МЗС Андрэй Папоў, каментуючы журналістам увядзенне пошліны на перамяшчэнне нафты па тэрыторыі рэспублікі.

Ён адзначыў, што гэта мера ў адказ на прынятае раней рашэнне Расіі аб увядзенні пошлін на экспартуемую ў Беларусь нафту.

Андрэй Папоў падкрэсліў, што Беларусь няўхільна выконвае міжнародныя абавязацельствы па забеспячэнню свабоды транзіту нафты па сваёй тэрыторыі. Праз нашу краіну пастаўляецца 50 працэнтаў усёй расійскай нафты, што накіроўваецца еўрапейскім спажыўцам.

Мілена АНУФРЫЁНАК, БЕЛТА.

«Гомельтранснафта Дружба» ажыццяўляе транзіт расійскай нафты ў запланаваным аб'ёме

Пра гэта паведаміў карэспандэнту БЕЛТА галоўны інжынер прадпрыемства Аляксандр Бардоўскі.

Ён адзначыў, што «Гомельтранснафта Дружба» працуе, як і раней, і забяспечвае неабходныя ўмовы для прапампоўвання экспартных аб'ёмаў расійскай нафты. Паводле яго слоў, на нафтатранспартнае прадпрыемства пакуль не паступала дадатковых інструкцый у рабоце ў сувязі з увядзеннем з 1 студзеня пошліны на перамяшчэнне расійскай нафты праз тэрыторыю Беларусі.

Адказваючы на пытанне аб тым, які аб'ём нафты плануецца транспартаваць у першым месяцы, Аляксандр Бардоўскі адзначыў, што з кампаніяй «Транснафта» раней узгоднена кантрольная лічба на студзень.

БЕЛТА.

«Белэнерга» падпісаў кантракт з РАТ «АЭС Расіі» на пастаўку ў Беларусь 3,5 млрд кВт гадз. энергіі

Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў галоўны спецыяліст упраўлення кадраў «Белэнерга» Уладзімір Кардуба.

Уладзімір Кардуба падкрэсліў, што ў 2007 годзе Беларусь гарантавала сабе пастаўкі электраэнергіі і з Расіі, і з Украіны. Ён нагадаў, што ў першым паўгоддзі ў рэспубліку будзе пастаўлена больш як 1,3 млр кВт гадз. украінскай энергіі.

БЕЛТА.

(Працяг тэмы на 6-й стар.)

Аляксандр СЕЛЯЗНЁЎ:

«Кошт «панелек» для чаргавікоў у сталіцы будзе не больш за 450 USD за кв. м»

Згодна з папярэднімі падлікамі, летась у рэспубліцы было ўведзена ў эксплуатацыю 4 млн 150 тысяч квадратных метраў агульнай плошчы жылых памяшканняў, або 97,4 працэнта гадавога задання.

Паводле інфармацыі міністра архітэктуры і будаўніцтва Аляксандра Селязнёва, будаўнікі выканалі прагнозныя паказчыкі ва ўсіх рэгіёнах краіны, за выключэннем Мінска, дзе не было пабудавана 130 тысяч квадратных метраў запланаванага жылля, што склала мінус 13 працэнтаў гадавога задання. Разам з тым у сельскай мясцовасці і малых гарадах было пабудавана летась 1 млн 654,5 тысячы квадратных метраў жылля, або 130 працэнтаў гадавога плана.

Суразмоўца адзначыў, што летась цэментавыя заводы атрымлівалі прыродны газ па кошту 73,5 долара за тысячу «кубоў». Пасля істотнага падаражання расійскага газу зараз кіраўніцтва будаўнічай галіны разлічвае атрымліваць гэта блакітнае паліва, без уліку ПДВ, па кошту ў межах 126—128 долараў. Вядома, што доля цэменту ў структуры жыллёвага цэнаўтварэння складае толькі каля 2—2,5 працэнта. Менавіта таму, на думку міністра, новая цана прыроднага газу павялічыць кошт будаўніцтва жылля толькі на 5—6 працэнтаў.

Аляксандр Селязнёў запэўніў, што па будаўніцтву жылля для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, дзяржава будзе прытрымлівацца раней вызначаных прыярытэтаў. Так, для гэтай катэгорыі грамадзян кошт квадратнага метра жылля ў дамах буйнапанельнага будаўніцтва сёлета вызначаны ў межах 360—400 долараў, у цагляных дамах — 400—450. У сталіцы кошт жылля будзе крыху большым: у панельных дамах на працягу года — да 450 долараў, у цагляных — 520—550 долараў за квадратны метр.

Сёлета ў краіне запланавана пабудаваць 4 млн 700 тысяч квадратных метраў жылля. Толькі ў Мінску сёлета неабходна ўвесці ў эксплуатацыю 1 млн 70 тысяч квадратных метраў жылля. Разам з тым у 2007 годзе ў сталіцы будзе пабудавана 710—715 тысяч квадратных метраў жылля для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Сяргей КУРКАЧ.

Мікалай ДАМАШКЕВІЧ:

«ВЫНІКІ ГОДА СТАНОЎЧЫЯ»

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

Вынікі 2006-га на Міншчыне: усе прагнозныя паказчыкі першага года пяцігодкі выкананы, і, як адзначыў старшыня Мінскага аблвыканкама Мікалай Дамашкевіч, людзі спрацавалі добра, планы здзейсніліся.

Аднак на дасягнутым спыняцца не трэба. Мікалай Дамашкевіч падчас выніковага пасяджэння кіруючых кадраў вобласці падкрэсліў, што ў новым годзе трэба звярнуць увагу на прыцягненне рэзерваў:

— На 2007 год планы зацверджаны. Аб'ёмы і патрабаванні больш вялікія, чым летась, таму ўсім нам трэба працаваць, удасканальваць сістэму кіравання дзеля дасягнення запланаванага. Адна з крыніц паспяховай дзейнасці — выкарыстанне рэзерваў прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці. Напрыклад, Міншчына вырабляе малака столькі ж, як дзве іншыя вобласці нашай краіны. Аднак грошай ад яго перапрацоўкі мы атрымліваем менш, чым астатнія рэгіёны. Мы можам зарабіць на продажы і перапрацоўцы малака на 62 мільярды рублёў больш. Гэта толькі адзін прыклад, як магчыма павялічыць прыбытак. Таму задача для ўсіх — працаваць на поўную моц, задзейнічаць свой інтэлект і энергію. Камандай кадраў вобласці я задаволены, таму галоўнае — за плённай дзейнасцю, — расказаў Мікалай Дамашкевіч.

Адным з галоўных дасягненняў работы вобласці за 2006 год старшыня Мінскага аблвыканкама лічыць паспяховае забеспячэнне праграмы харчовай бяспекі. «Сельскагаспадарчыя прадпрыемствы вобласці «кормяць» горад-герой Мінск. 50 працэнтаў мяса і мясных прадуктаў, 66 працэнтаў малочных вырабаў, якімі гандлююць у сталіцы, забяспечвае Міншчына, — падкрэсліў Мікалай Дамашкевіч. — Акрамя таго, на нас ляжыць адказнасць і за забеспячэнне прадуктамі жыхароў вобласці. Палова насельніцтва Беларусі атрымлівае харчовыя тавары з Мінскай вобласці?».

У 2007 годзе яшчэ большую ўвагу трэба звярнуць і на вырашэнне праблем чалавека. «Мы ўдзячныя ўсім нашым людзям, якія падтрымліваюць і дапамагаюць рэалізоўваць планы. Калі б мы ні звярнуліся да настаўнікаў, школьнікаў, пенсіянераў, да тых, хто працуе на прадпрыемствах — заўсёды яны падтрымлівалі і дапамагалі. Дырэктыва № 2 , наша сумленнасць і адказнасць абавязваюць прыслухоўвацца да праблем чалавека і працаваць дзеля яго, — кажа Мікалай Дамашкевіч. — Таму ўвага да людзей, да іх надзённых праблем — гэта галоўнае. Ад іх самаадчування, добрага настрою, дабрабыту залежыць развіццё вобласці і краіны».

Такім чынам, вобласць у новым годзе будзе працягваць нарошчваць тэмпы свайго развіцця. Як упэўнены Мікалай Дамашкевіч, «у нас атрымаецца ўсё, што намечана».

Дзмітрый АЛЬФЕР.

ДА КАНЦА ПЕРШАЙ ДЭКАДЫ БУДЗЕ ЦЁПЛА

Як паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава, у выхадныя па рэспубліцы чакаецца сырое надвор'е, слабы туман. Часам выпадуць ападкі, у асноўным дождж. Вецер парывісты. Тэмпература паветра ноччу будзе вагацца ад мінус 1 да плюс 5 градусаў, а днём складзе 1—7 градусаў цяпла.

Таццяна ЛОБАС, БЕЛТА.

У НАВАГОДНІЯ ДНІ — СА ЗВЯЗДОЎСКІМІ ПРЫЗАМІ

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У гэтыя навагоднія дні многія з нашых чытачоў-падпісчыкаў стануць уладальнікамі звяздоўскіх прызоў!

Падставай для такога сцвярджэння стала ўчарашняе правядзенне ў сценах рэдакцыі штоквартальнай латарэі па выніках падпіскі на 1-ы квартал і першае паўгоддзе 2007 года. Традыцыйна вяршыцелямі лёсаў усіх прызоў сталі госці. На гэты раз — падпісчыкі з Мінска Уладзімір Кандратавіч ЛЯЛЬКОЎ і Людміла Іосіфаўна СТАСІЛЕВІЧ, а таксама супрацоўніца РУП «Белсаюздрук» Наталля МАГЛЁЎЧЫК *(на фота ў цэнтры)*. З іх лёгкай рукі ўладальнікамі 17 каштоўных прызоў, сярод якіх — печка-СВЧ, каляровы тэлевізар «Віцязь» і халадзільнік «Атлант», сталі падпісчыкі нашай газеты з усіх рэгіёнаў Беларусі.

Падрабязнасці розыгрышу — у наступным нумары.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ДЭКЛАРАЦЫЮ ЛЕПШ ЗАПАЎНЯЦЬ У ПЕРШЫ МЕСЯЦ ГОДА

Згодна з заканадаўствам рэспублікі, па заканчэнні каляндарнага года пэўная частка работнікаў краіны павінна прадаставіць у падатковы орган дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе.

Паводле слоў начальніка ўпраўлення падаткаабкладання грамадзян, дэкларавання даходаў і маёмасці Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Марыны Грыгарчук, сёлета запаўняць дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе павінны фізічныя асобы, якія атрымлівалі даходы з дзвюх і больш крыніц, а іх сума перавысіла 7 млн 360 тысяч 10 рублёў. Нагадаю, што дэкларацыю трэба падаць не пазней чым да 1 сакавіка ўключна. Калі грамадзянін забыў пра тыя ці іншыя даходы і не зусім дакладна адлюстраваў іх у сваёй дэкларацыі, тады да 15 красавіка можна падаць удакладненую дэкларацыю. Да 1 мая жыхары краіны атрымаюць паведамленне ад падатковай службы. А вось да 15 мая падаткаплацельшчыкі павінны цалкам разлічыцца па падатках у бюджэт.

Сёлета дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе пададуць каля 500 тысяч жыхароў нашай краіны. Зрэшты, летась у падатковыя інспекцыі было пададзена каля 180 тысяч дэкларацый. Павелічэнне колькасці дэкларантаў адбудзецца галоўным чынам за кошт тых работнікаў, якія ў мінулым годзе не атрымлівалі падатковыя сацыяльныя і маёмасныя льготы па месцы асноўнай працы. Сёлета такая катэгорыя работнікаў будзе вымушана падаваць дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе ў падатковы орган, каб атрымаць падатковыя льготы. Зараз падатковыя інспекцыі працягваюць работу ў звычайным рэжыме. Аднак пачынаючы з 12 лютага інспекцыі пачнуць працаваць у будні да 20.00, а ў выхадныя — да 15.00. Марына Грыгарчук раіць падаткаплацельшчыкам, якія разлічваюць на атрыманне падатковых ільгот, звярнацца ў інспекцыі ў першы месяц года, каб не трапіць у чэргі ў лютым.

Сяргей КУРКАЧ.

АДПРАЎКА МАЛАДОГА ПАПАЎНЕННЯ ВА ЎЗБРОЕНЫЯ СІЛЫ ПАЧНЕЦЦА 15 СТУДЗЕНЯ

Адпраўка маладога папаўнення ва Узброеныя Сілы, пагранічныя і ўнутраныя войскі і іншыя воінскія фарміраванні Беларусі пройдзе ў перыяд з 15 па 30 студзеня. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў Міністэрстве абароны. Усяго ў ходзе асенне-зімовага прызыву ў беларускую армію плануецца прызваць каля 10 тыс. чалавек. 11 лютага ва ўсіх злучэннях і воінскіх часцях Узброеных Сіл навабранцы прымуць ваенную прысягу.

БЕЛТА.

КУПІ БІЛЕТ ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

Камп'ютарная сістэма цэнтралізаванага продажу білетаў на праезд у пасажырскім транспарце краіны будзе распрацавана ў першай палове гэтага года.

Як паведамілі ў Міністэрстве транспарту і камунікацый, аўтавакзалы і аўтастанцыі будуць аб'яднаны ў адзіную інфармацыйную сетку. Мінчане і госці сталіцы змогуць атрымліваць даведачную інфармацыю і браніраваць білеты праз Інтэрнэт. З'явіцца таксама магчымасць набываць білеты за наяўны і безнаяўны разлікі (з выкарыстаннем банкаўскіх пластыкавых картак) на аўтобусы, цягнікі і самалёты ў касах пасажырскіх тэрміналаў, незалежна ад месца адпраўлення транспарту. Атрыманне даведачнай інфармацыі і продаж білетаў таксама будзе ажыццяўляцца праз інфакіёскі, размешчаныя ў «спальных раёнах» сталіцы.

Ігар ГОЛАД, «Мінск—Навіны».

У СМАЛЯВІЧАХ УЗАРВАЛАСЯ ГРАНАТА

Мясцоваму жыхару пашанцавала застацца ў жывых: чалавек пасля выбуху атрымаў раненні ног і твару.

Выратавала яго добрая рэакцыя. Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, здарэнне адбылося а палове дзесятай раніцы ля гаража пацярпелага. Мужчына, які прыйшоў сюды, убачыў, што ля дзвярэй гаража ляжаць чатыры цагліны. Каб адчыніць будынак, ён вымушаны быў адкінуць убок нечаканую перашкоду. І быў непрыемна здзіўлены: убіраючы цагліны, ён убачыў прадмет, падобны на гранату РГД-5. А пачуўшы падазроны шчаўчок (спрацавала скаба зрывальніка), чалавек паспеў схавацца ў гаражы. Пасля гэтага граната ўзарвалася: у выніку пацярпелы атрымаў лёгкія раненні. Дарэчы, пасля аказання медыцынскай дапамогі мужчыну ўрачы адпусцілі дадому. Праваахоўнікам удалося ўстанавіць асобу зламысніка, які пакінуў выбухованебяспечны «сюрпрыз» ля гаража. Гэта таксама мясцовы жыхар, у якога дома была знойдзена загваздка ад гранаты.

Ігар ГРЫШЫН.

ПАЛЯВАННЕ НА РЫСЬ ЯШЧЭ НАПЕРАДЗЕ

Як ужо коратка паведамлялася, да 15 красавіка на тэрыторыі Расонскай дзяржаўнай лесагаспадарчай установы будзе дазволены адстрэл і адлоў... рысі. Як вядома, еўрапейская рысь занесена ў Чырвоную кнігу краіны. У чым справа? Па каментарыі мы звярнуліся да вядучага інжынера па паляўнічай гаспадарцы Расонскай лесапаляўнічай гаспадаркі Франца Варсло.

— Справа ў тым, што толькі на тэрыторыі нашага раёна жыве 60 галоў рысі. Гэта даволі шмат, асабліва калі ўлічыць, што «лясная кошка» — птушніца, г.зн. аснову яе рацыёна складаюць глушцы і цецерукі, на якіх таксама багаты наш край, — патлумачыў Франц Сцяпанавіч. — Адной рысі ў месяц патрэбна да 50 глушцоў, а кошт толькі адной птушкі пры арганізацыі паляванняў для іншаземных паляўнічых даходзіць да 400 еўра. Падлічыце, які ўрон можа нанесці толькі адна рысь? Таму, каб нейкім чынам зменшыць урон для такавішчаў, гаспадарка атрымала дазвол ад Мінпрыроды на адстрэл і адлоў 10 самцоў еўрапейскай рысі. Ён дзейнічае з 1 снежня мінулага года. Аднак за прайшоўшы ўжо больш чым месяц пакуль не было здабыта ніводнай «лясной кошкі», чаму ёсць свае тлумачэнні. Па-першае, вось так проста любы жадаючы дазвол на адстрэл рысі не атрымае — ён выпісаны на работніка гаспадаркі і працэс павінен адбывацца выключна ў яго прысутнасці. Па-другое, рысь актыўна будзе наведваць такавішчы крыху пазней — у канцы лютага—пачатку сакавіка. Тады якраз — па насту — і мэтазгодна займацца яе адстрэлам ці адловам. Дарэчы, пакуль ніводнай заяўкі менавіта на адлоў драпежніцы ад запаведнікаў, заказнікаў ці заапаркаў яшчэ не паступала, тым не менш пэўная колькасць рысі ўсё ж будзе найперш адлоўлена. Пэўная праблема заключаецца і ў тым, што за 30 гадоў, пакуль паляванне на рысь было забаронена, страчаны і самі навыкі таго палявання, яго спосабы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

АНГЕЛА МЕРКЕЛЬ ЛІЧЫЦЬ АПРАЎДАНЫМІ АБМЕЖАВАННІ НА ІНВЕСТЫЦЫІ РАСІЙСКІХ КАМПАНІЙ У ЕЎРОПЕ

Федэральны канцлер Германіі Ангела Меркель мяркуе, што цяперашнія абмежаванні на інвестыцыі расійскіх энергетычных кампаній у Заходняй Еўропе апраўданыя, хоць імкненне Расіі да атрымання непасрэднага доступу на еўрапейскія рынкі «цалкам легітымнае».

Такія падкантрольныя дзяржаве энергетычныя кампаніі, як расійскі газавы магнат «Газпрам», спрабуюць шляхам набыцця акцый еўрапейскіх кампаній атрымаць доступ да канчатковага спажыўца ў ЕС. Гэтая тактыка не знаходзіць адабрэння на Захадзе, бо Расія аб'явіла большую частку сваёй эканомікі стратэгічнымі галінамі, што ў сваю чаргу вядзе да сур'ёзных абмежаванняў для заходніх інвестараў. Напрыклад, пры распрацоўцы радовішчаў нафты і газу фактычна дапускаецца толькі мінарытарны ўдзел замежных акцыянераў. Урад Германіі, са свайго боку, паклапаціўся аб тым, каб расійскія кампаніі не змаглі сканцэнтраваць у сваіх руках занадта вялікага ўплыву ў такіх кампаніях, як EADS і Telekom.

На фоне ўсё ўзрастаючай залежнасці Еўропы ад расійскага газу тэма энергетыкі застаецца адной з праблемных у адносінах паміж Расіяй і ЕС. Пакуль Масква адмаўляецца ратыфікаваць Энергетычную хартыю, якая б аблегчыла доступ на расійскі рынак і ўмацавала б надзейнасць паставак расійскіх энергарэсурсаў. Менавіта з-за такой пазіцыі Расіі Польшча нядаўна перашкаджала правядзенню перагавораў адносна заключэння новага дагавора аб партнёрстве паміж РФ і ЕС.

БРЫТАНСКІЯ СІНОПТЫКІ ПРАДКАЗВАЮЦЬ САМЫ СПЯКОТНЫ ГОД НА ПЛАНЕЦЕ

2007 год можа аказацца самым спякотным годам для планеты. Згодна са звесткамі Метэаралагічнага ўпраўлення Вялікабрытаніі, перыяд пацяплення, які зацягнуўся, — вынік дзейнасці «Эль-Ніньё» ў Ціхім акіяне — спрыяе глабальнаму павышэнню тэмпературы.

Спецыялісты адзначаюць 60 працэнтаў верагоднасці таго, што сярэдняя гадавая тэмпература на паверхні Зямлі перавысіць рэкордны паказчык 1998 года. Сярэднегадавая тэмпература паверхні Зямлі ў 2007 годзе чакаецца на 0,54 градуса вышэй шматгадовага паказчыка — 14 градусаў па Цэльсію. У 1998 годзе гэты паказчык быў перавышаны на 0,52 градуса. Прагноз Метэаўпраўлення грунтуецца на двух галоўных фактарах, — сказаў кіраўнік даследчай групы Крыс Фоланд: першы фактар — выкід у атмасферу парніковых газаў, якія выклікаюць пацяпленне, а другі фактар — «Эль-Ніньё».

Прыродны феномен «Эль-Ніньё» характарызуецца незвычайна цёплымі плынямі акіяна ля паўночна-заходняга ўзбярэжжа Паўднёвай Амерыкі, якія, на думку вучоных, больш за ўсё ўплываюць на штогадовыя змяненні ў зямным клімаце. Тэмпературныя рэкорды наступіўшага года тлумачацца тым, што «Эль-Ніньё» ўжо аказаў свой уплыў на воды Ціхага акіяна, і эфект гэтага ўплыву будзе сказвацца яшчэ тры месяцы.

КАДРЫ ПАКАРАННЯ ХУСЕЙНА ДАВЯЛІ ДА САМАЗАБОЙСТВА МАЛАДУЮ АЛЖЫРКУ

Жыхарка горада Аран на паўночным захадзе Алжыра выкінулася з акна сваёй кватэры. Жанчыну вельмі ўзрушылі кадры распаўсюджанага відэазапісу пакарання былога іракскага дыктатара Садама Хусейна.

Паводле слоў бацькоў загінулай, іх дачка ўпала ў глыбокую дэпрэсію, яна гаварыла, што ў свеце не засталося нічога святога, што людзі азвярэлі і страцілі чалавечае аблічча. Нагадаем, што ў святочныя дні пакаранне Хусейна ўскосным чынам стала прычынай аднаго няшчаснага выпадку: у Пакістане 9-гадовы хлопчык, гуляючы ў «павешанне Хусейна», выпадкова павесіўся сам.

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.01.2007 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў	
1 долар ЗША	2 140,00	Цэнтрабанк РФ	
1 еўра	2 806,82	USD	26,3311
1 латвійскі лат	4 022,18	10 UAH	52,1987
1 літоўскі літ	812,85	1000 BYR	12,2906
1 чэшская крона	101,95	EUR	34,6965
1 польскі злоты	729,93	Курс у гандлёвых кампаніях (на 04.01.2007)	
1 расійскі рубель	81,13	USD	2200 / 2320
1 украінская грыўня	424,18		

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі на самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ISSN 1990-763X

«БАБСКІЯ РАЗБОРКІ»

У Наваполацку міліцыянеры затрымалі маладую жанчыну, якая знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску. На вуліцы Маладзёжная яна каля 23.00 пабіла дзвюх дзяўчат. Узбуджана крымінальная справа па артыкулу «Хуліганства».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗВЯЗДА 5 студзеня 2007 г.

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ БЮДЖЭЦЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ НА 2007 ГОД

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 11 снежня 2006 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 20 снежня 2006 года

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 4 студзеня.)

Парадак выкарыстання сродкаў рэспубліканскага фонду падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, харчавання і аграрнай навукі вызначаецца Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь па ўзгадненню з Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 20. Устанавіць, што ў 2007 годзе:

1. Даходы рэспубліканскага дарожнага фонду ўтвараюцца ў суме 1 873 645 067,0 тыс. рублёў, у тым ліку за кошт:

акцызаў на аўтамабільнае паліва (акрамя імпартаванага) у памеры 35,3 працэнта ў суме 651 852 470,0 тыс. рублёў;

падатку на набыццё аўтамабільных транспартных сродкаў у суме 30 000 000,0 тыс. рублёў;

падатку з карыстальнікаў аўтамабільных дарог у суме 1 110 080 597,0 тыс. рублёў;

платы за праезд цяжкавагавых і буйнагабарытных аўтамабільных транспартных сродкаў па аўтамабільных дарогах агульнага карыстання Рэспублікі Беларусь у суме 4 650 000,0 тыс. рублёў;

збору за праезд аўтамабільных транспартных сродкаў замежных дзяржаў па аўтамабільных дарогах агульнага карыстання Рэспублікі Беларусь у памеры 50 працэнтаў у суме 7 675 000,0 тыс. рублёў;

збору за выдачу дазволаў на праезд аўтамабільных сродкаў па тэрыторыях замежных дзяржаў у памеры 60 працэнтаў у суме 8 505 000,0 тыс. рублёў;

платы за праезд па аўтамабільнай дарозе М-1/Е30 Брэст—Мінск—граніца Расійскай Федэрацыі ў суме 60 882 000,0 тыс. рублёў.

Парадак залічэння даходаў у рэспубліканскі дарожны фонд устанаўліваецца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

2. Расходы рэспубліканскага дарожнага фонду вызначаюцца ў суме 1 883 922 347,0 тыс. рублёў з улікам рэшткаў указанага фонду, якія ўтвараліся на 1 студзеня 2007 года, у суме 10 277 280,0 тыс. рублёў.

3. Накірункі і памеры выкарыстання сродкаў рэспубліканскага дарожнага фонду ў межах расходаў устанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 21. Устанавіць, што ў 2007 годзе:

1. Сродкі мясцовых фондаў аховы прыроды акумулююцца ў рэспубліканскім фондзе аховы прыроды.

2. Даходы рэспубліканскага фонду аховы прыроды ўтвараюцца ў суме 392 500 000,0 тыс. рублёў, у тым ліку за кошт:

2.1. падатку за выкарыстанне прыродных рэсурсаў (экалагічнага падатку) у частцы плацяжоў:

за выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ў суме 288 909 219,0 тыс. рублёў;

за скіды сцёкавых вод або забруджвальных рэчываў у навакольнае асяроддзе ў суме 48 650 095,0 тыс. рублёў;

за размяшчэнне адходаў вытворчасці і за размяшчэнне тавараў, якія змешчаны пад мытны рэжым зніжчэння і страцілі свае спажывецкія ўласцівасці, а таксама адходаў, якія ўтвараюцца ў выніку зніжчэння тавараў, якія змешчаны пад гэты рэжым, у суме 47 927 847,0 тыс. рублёў;

за вытворчасць і (або) імпарт пластмасавай тары і іншых тавараў, пасля страты спажывецкіх уласцівасцяў якіх утвараюцца адходы, якія аказваюць шкоднае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе і патрабуюць арганізацыі сістэм іх збору, абясшкоджвання і (або) выкарыстання, у суме 1 935 763,0 тыс. рублёў;

2.2. збору за прадастаўленне права ўвозу на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь азонаразбуральных рэчываў у суме 435 000,0 тыс. рублёў;

2.3. даходаў ад рэалізацыі канфіскаваных або іншым чынам звернутых у даход дзяржавы прылад паляванні і здабычы рыбы і іншых водных жывёл, а таксама ад продажу незаконна здабытай з дапамогай гэтых прылад прадукцыі ў суме 36 780,0 тыс. рублёў;

2.4. пакрыцця ўрону, нанесенага ў выніку шкоднага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе, у суме 2 063 241,0 тыс. рублёў;

2.5. іншых даходаў у суме 2 542 055,0 тыс. рублёў.

3. Расходы рэспубліканскага фонду аховы прыроды вызначаюцца ў суме 372 875 000,0 тыс. рублёў.

4. Накірункі і памеры выкарыстання сродкаў рэспубліканскага фонду аховы прыроды ў межах расходаў устанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 23. Устанавіць, што ў 2007 годзе:

1. Даходы дзяржаўнага пазабюджэтнага Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь утвараюцца ў суме 9 973 297 630,0 тыс. рублёў і накіроўваюцца на расходы ў суме 9 973 297 630,0 тыс. рублёў згодна з дадаткам 10.

2. Частка сродкаў пазабюджэтнага Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь у суме 122 707 337,0 тыс. рублёў накіроўваецца на фінансаванне мерапрыемстваў па забеспячэнню дзейнасці дзяржаўнай службы занятасці, у тым ліку ў бюджэты абласцей і г. Мінска ў выглядзе бягучых трансфертаў у суме 115 207 337,0 тыс. рублёў, з іх Брэсцкай вобласці — 17 763 763,0 тыс. рублёў, Віцебскай — 18 932 530,0 тыс. рублёў, Гомельскай — 16 876 500,0 тыс. рублёў, Гродзенскай — 14 438 525,0 тыс. рублёў, Мінскай — 19 349 990,0 тыс. рублёў, Магілёўскай вобласці — 17 945 540,0 тыс. рублёў, г. Мінску — 9 900 489,0 тыс. рублёў.

3. Фінансаванне расходаў на ўтрыманне апарата кіравання тэрытарыяльнымі органамі дзяржаўнай службы занятасці — упраўленняў абласных службаў занятасці насельніцтва, гарадскіх (рэгіянальных), раённых цэнтраў занятасці насельніцтва ажыццяўляецца за кошт сродкаў адпаведных мясцовых бюджэтаў.

4. Прыпыніць дзеянне частак чацвёртай артыкула 13 і артыкула 17 Закона Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2006 года «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 94, 2/1222), а таксама частак чацвёртай артыкула 18, частак трэцяй артыкула 19, частак другой артыкула 22 і артыкула 26 указанага Закона ў частцы фінансавання мерапрыемстваў па забеспячэнню дзейнасці дзяржаўнай службы занятасці за кошт сродкаў дзяржаўнага фонду садзейнічання занятасці.

Сродкі, якія спаганяюцца з найманымі за парушэнне патрабаванняў Закона Рэспублікі Беларусь «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь», залічваюцца ў дзяржаўны пазабюджэтны Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.

5. Парадак фарміравання і выкарыстання сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь устанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненню з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 24. Устанавіць, што ў 2007 годзе:

1. Утвараецца дзяржаўны мэтавы бюджэтны фонд развіцця будаўнічай навукі за кошт адлічэнняў, якія робяць арганізацыі, што ажыццяўляюць будаўніча-мантажныя работы, у памеры 0,5 працэнта ад сабекошту выкананых будаўніча-мантажных работ. Указаныя адлічэнні ўключаюцца ў затраты, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні прыбытку і фарміраванні цаны на будаўніча-мантажныя работы.

Адлічэнні ва ўказаны фонд не ажыццяўляюцца арганізацыямі, якія вядуць будаўніча-мантажныя работы на аб'ектах жыллёвага будаўніцтва і за межамі Рэспублікі Беларусь.

Налічаныя плацельшчыкамі сродкі па адлічэннях у дадзены фонд пералічваюцца імі штомесяц не пазней чым 22-га чысла месяца, які надыходзіць за справаздачным, на рахункі падатковых органаў па месцы пастаноўкі на ўлік з наступным залічэннем іх на адзіны казначэйскі рахунак Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь.

2. Даходы дзяржаўнага мэтавага бюджэтнага фонду развіцця будаўнічай навукі ўтвараюцца ў суме 29 700 000,0 тыс. рублёў і накіроўваюцца на расходы ў суме 29 700 000,0 тыс. рублёў згодна з дадаткам 11.

Парадак залічэння сродкаў у дзяржаўны мэтавы бюджэтны фонд развіцця будаўнічай навукі і накірункі яго выкарыстання вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненню з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

3. Правы і абавязкі плацельшчыкаў адлічэнняў у дзяржаўны мэтавы бюджэтны фонд развіцця будаўнічай навукі, адказнасць за правільнасць іх падліку і своечасовасць платы, парушэнне ўстаноўленага тэрміну прадстаўлення дэкларацый (разлікаў) па адлічэннях у гэты фонд, парадак спагнання гэтых плацяжоў, а таксама правы падатковых органаў насці з артыкулам 19 Закона Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 1998 года «Аб энергазберажэнні» (Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1998 г., № 31—32, ст. 470).

Накірункі і памеры фінансавання мерапрыемстваў і праграм па энергазберажэнню ўстанаўліваюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 27. Устанавіць, што ў 2007 годзе:

1. Сродкі, якія паступаюць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь ад юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў у лік пагашэння імі запазычанасці за спажытыя энергарэсурсы, якая ўтварылася на 1 лютага 1996 года, пералічваюцца ў рэспубліканскі бюджэт.

Пратэрмінаваная запазычанасць юрыдычных асоб за спажытыя энергарэсурсы, якая ўтварылася на 1 лютага 1996 года, за выключэннем адтэрмінаванай у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, спаганяецца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь у бясспрэчным парадку за кошт юрыдычных асоб.

2. На пакрыццё юрыдычным асобам сродкаў у замежнай валюце, заблакіраваных у Знешэканомбанку СССР па стану на 1 студзеня 1992 года і аднесеных да ўнутранага дзяржаўнага доўгу Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь, накіроўваюцца сродкі, указаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, а таксама сродкі, прадугледжаныя ў рэспубліканскім бюджэце на гэтыя мэты.

Юрыдычным асобам, указаным у частцы першай гэтага пункта, можа ажыццяўляцца залік па іх непагашанай запазычанасці:

па падатках, зборах і іншых абавязковых плацяжах, а таксама іншых плацяжах (па бюджэтных пазыках, плацяжах, ажыццёўленых з рэспубліканскага бюджэту ў адпаведнасці з гарантыямі Урада Рэспублікі Беларусь), а таксама працэнтах і санкцыях па пратэрмінаваных плацяжах;

па запазычанасці за спажытыя энергарэсурсы, якая ўтварылася на 1 лютага 1996 года, у тым ліку пры наяўнасці дагавораў аб пераводзе доўгу або аб уступцы патрабаванняў гэтых юрыдычных асоб.

3. Не падлягаюць разблакіраванню і адносяцца на змяншэнне ўнутранага дзяржаўнага доўгу сродкі ў замежнай валюце, заблакіраваныя ў Знешэканомбанку СССР па стану на 1 студзеня 1992 года, якія лічацца ў дзяржаўных юрыдычных асоб пры іх прыватызацыі.

Артыкул 28. Устанавіць, што ў 2007 годзе:

1. Памер прыросту ўнутранага дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь не можа перавышаць 3 працэнтаў ад валавога ўнутранага прадукту.

2. Запазычанасць па крэдытах, якія прадастаўлены Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на фінансаванне дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту і аднесены на ўнутраны дзяржаўны доўг у 1991—2003 гадах, рэструктурызуецца праз эмісію дзяржаўных каштоўных папер у парадку і памерах, устаноўленых Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 29. Устанавіць, што ў 2007 годзе:

1. Гранічны памер гарантый, якія прадастаўляюцца Урадам Рэспублікі Беларусь па крэдытах, якія выдаюцца банкамі Рэспублікі Беларусь юрыдычным асобам Рэспублікі Беларусь, складае 500,0 млрд рублёў.

2. На выкананне гарантый, якія прадаставіў Урад Рэспублікі Беларусь па крэдытах, якія выдадзены банкамі Рэспублікі Беларусь юрыдычным асобам Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь ва ўстаноўленым парадку накіроўваюцца сродкі, якія прадугледжаны ў рэспубліканскім бюджэце на абслугоўванне ўнутранага дзяржаўнага доўгу і ў рэспубліканскім фондзе падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, харчавання і аграрнай навукі, а таксама ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь сродкі інавацыйных фондаў.

Плацяжы, якія ажыццёўлены з рэспубліканскага бюджэту ў адпаведнасці з гарантыямі Урада Рэспублікі Беларусь, спаганяюцца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь у бясспрэчным парадку з рахункаў юрыдычных асоб — крэдытаатрымальнікаў са спагнаннем працэнтаў з выплачанай гэтым Міністэрствам сумы па крэдытах, прадастаўленых у замежнай валюце, у памеры не менш як 8 працэнтаў ад сумы кожнага плацяжу за кошт сродкаў, якія паступаюць у рэспубліканскі бюджэт у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

3. На выкананне гарантый, якія прадаставіў Урад Рэспублікі Беларусь па замежных пазыках (крэдытах), выдадзеных юрыдычным асобам Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь ва ўстаноўленым парадку накіроўваюцца сродкі, якія прадугледжаны ў рэспубліканскім бюджэце на абслугоўванне знешняга дзяржаўнага доўгу.

Гарантыйныя плацяжы, якія ажыццёўлены Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь з рэспубліканскага бюджэту па замежных пазыках (крэдытах), вяртаюцца пазычальнікамі-рэзідэнтамі ў рэспубліканскі бюджэт з выплатай 8 працэнтаў гадавых ад сумы плацяжу.

Гарантыйныя плацяжы па замежных пазыках (крэдытах), якія не вернуты ў рэспубліканскі бюджэт пазычальнікамі-рэзідэнтамі ва ўстаноўленыя тэрміны, спаганяюцца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь у бясспрэчным парадку з іх рахункаў.

4. Плата за прадастаўленне гарантый Урада Рэспублікі Беларусь па крэдытах банкаў Рэспублікі Беларусь, а таксама знешніх дзяржаўных пазыках (крэдытах) ажыццяўляецца аднаразова ў памеры 1,5 працэнта ад сумы крэдыту (пазыкі).

5. Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь мае права зменшыць памер фінансавання юрыдычных асоб — пазычальнікаў крэдытаў, калі яны фінансуюцца з рэспубліканскага бюджэту, на суму зробленых або падлягаючых выкананню плацяжоў з рэспубліканскага бюджэту ў адпаведнасці з гарантыямі Урада Рэспублікі Беларусь і налічаных працэнтаў.

6. Абласныя і Мінскі гарадскі Саветы дэпутатаў:

6.1. зацвярджаюць гранічны памер гарантый, якія прадастаўляюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, па крэдытах, што выдаюцца банкамі Рэспублікі Беларусь юрыдычным асобам Рэспублікі Беларусь:

для развіцця жыллёвага будаўніцтва на вёсцы і рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, якія прайшлі дзяржаўную комплексную экспертызу;

на іншыя мэты, які не перавышае 20 працэнтаў расходнай часткі абласных, раённых і гарадскіх бюджэтаў;

6.2. прадугледжваюць накіраванне сродкаў мясцовых бюджэтаў на выкананне гарантый, прадастаўленых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, па крэдытах, выдадзеных банкамі Рэспублікі Беларусь юрыдычным асобам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 30. Устанавіць, што ў 2007 годзе бюджэтныя пазыкі прадастаўляюцца абласным і Мінскаму гарадскому выканаўчым камітэтам на фінансаванне часовых касавых разрываў, якія ўзнікаюць пры выкананні бюджэтаў абласцей і г. Мінска, па рашэннях Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 31. Устанавіць ліміт знешняга дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь на канец 2007 года ў памеры 2 млрд долараў ЗША.

Абслугоўванне і пагашэнне знешняга дзяржаўнага доўгу ажыццяўляюцца з прыцягненнем сродкаў рэспубліканскага бюджэту па пераліку крэдытных ліній згодна з дадаткам 12.

Артыкул 32. Устанавіць, што ў 2007 годзе ў даход рэспубліканскага бюджэту паступаюць сродкі, у тым ліку ў замежнай валюце, атрыманыя дзяржаўнымі органамі, іх тэрытарыяльнымі падраздзяленнямі, за выключэннем:

сродкаў, якія атрымліваюць Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, Камітэт дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны цэнтр бяспекі інфармацыі пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны камітэт пагранічных войскаў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, падпрадкаваныя ім воінскія часці, арганізацыі, органы і падраздзяленні ад рэалізацыі прадукцыі (работ), матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў, аб'ектаў нерухомасці, здачы другасных рэсурсаў, аказання платных паслуг;

сродкаў, якія атрымлівае Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, а таксама падпрадкаваныя яму воінскія часці і арганізацыі ад здачы другасных рэсурсаў, аказання (выканання) платных паслуг (работ), выдачы (водпуску) матэрыяльных сродкаў за плату ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

сродкаў, якія атрымліваюць органы і ўстановы крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь;

сродкаў, якія паступаюць у Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь і падпрадкаваныя яму ўстановы ад аказання платных паслуг юрыдычным асобам па часоваму захоўванню тавараў і за запазычанне матэрыяльных каштоўнасцяў дзяржаўнага і мабілізацыйнага рэзерваў;

сродкаў, якія атрымліваюць органы дзяржаўнай статыстыкі ад распаўсюджвання зводных статыстычных даных (інфармацыі), аказання іншых інфармацыйных паслуг, здачы ў арэнду будынкаў, збудаванняў і нежылых памяшканняў, якія знаходзяцца ў іх на балансе;

сродкаў, якія паступаюць у дзяржаўныя натарыяльныя канторы за аказанне дадатковых платных паслуг, звязаных з ажыццяўленнем натарыяльных дзеянняў;

сродкаў, якія атрымлівае Дзяржаўная фельд'егерская служба пры Міністэрстве сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь ад аказання паслуг фельд'егерскай сувязі;

заявачных узносаў іншаземных удзельнікаў міжнародных спартыўных мерапрыемстваў, якія паступаюць на рахунак Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь для правядзення мерапрыемстваў;

сродкаў, якія атрымліваюць агульныя і гаспадарчыя суды пры прымусовым выкананні па маёмасных спагнаннях;

сродкаў, якія паступаюць у замежныя ўстановы Рэспублікі Беларусь за аказанне консульскіх паслуг;

іншых сродкаў у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 33. Устанавіць, што ў 2007 годзе ваеннаслужачым (акрамя ваеннаслужачых тэрміновай службы), асобам начальніцкага і радавога саставу органаў унутраных спраў, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях грашовая кампенсацыя ўзамен харчовага пайка ажыццяўляецца ў памеры 58 500 рублёў у месяц.

Артыкул 34. Устанавіць, што ў 2007 годзе:

1. Адкрыццё і абслугоўванне Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь і іншымі банкамі рахункаў дзяржаўных органаў і арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту (бюджэтных арганізацый), іншых арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў па адкрытых імі рахунках для размяшчэння бюджэтных сродкаў, а таксама выкананне аперацый са сродкамі рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў ажыццяўляюцца без спагнання платы.

За карыстанне грашовымі сродкамі рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, якія знаходзяцца і размешчаны на рахунках у банках, у тым ліку ў Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь, банкі выплачваюць у даход адпаведнага бюджэту працэнты па стаўцы, устаноўленай Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

2. Залічэнне на ўкладныя рахункі і выплата, у тым ліку з выкарыстаннем банкаўскіх пластыкавых картак, заработнай платы, пенсій, дапамог, стыпендый і іншых грашовых выплат, якія праводзяцца грамадзянам у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, ажыццяўляюцца банкамі без спагнання працэнтаў.

3. Абслугоўванне знешніх дзяржаўных пазык, якія пагашаюцца за кошт бюджэтных сродкаў, ажыццяўляецца банкамі, упаўнаважанымі Урадам Рэспублікі Беларусь абслугоўваць замежныя крэдыты, з выплатай узнагароджання ў памеры не больш як 0,02 працэнта ад сумы кожнага плацяжу за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту згодна з дадаткам 7, уключаючы аб'екты камунальнай уласнасці (за выключэннем аб'ектаў будаўніцтва (рэканструкцыі) дадатковай інфраструктуры аграрадкоў), Дзяржаўнай праграмы па пераадоленню наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 2006—2010 гады, а таксама за кошт рэспубліканскага фонду аховы прыроды, рэспубліканскага дарожнага фонду і дзяржаўнага пазабюджэтнага Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, вызначаюцца ў Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграме на 2007 год, якая зацвярджаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 35. Нарматыўныя прававыя акты, якія цягнуць павелічэнне або памяншэнне аб'ёму даходаў, расходаў і (або) гранічнага памеру дэфіцыту, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на 2007 год, прымаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь або з яго згоды.

Ураду Рэспублікі Беларусь прынеабходнасці ва ўстаноўленым парадку ўносіць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь прапановы аб удакладненні асобных паказчыкаў рэспубліканскага бюджэту на 2007 год не больш як адзін раз у квартал.

Артыкул 36. Устанавіць, што ў 2007 годзе:

1. Рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання і іншыя дзяржаўныя арганізацыі, падпрадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя выканаўчыя камітэты, арганізацыі, якія фінансуюцца з бюджэту (бюджэтныя арганізацыі), ажыццяўляюць расходы ў межах планавых асігнаванняў, якія прадугледжаны ў бюджэтным роспісу, зацверджаным адпаведна Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь і фінансавымі ўпраўленнямі (аддзеламі) мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

2. Нарматыўныя прававыя акты, якія прыняты (выдадзены) да 2007 года, аб выдзяленні сродкаў або якія ўстанаўліваюць парадак фінансавання ў 2007 годзе, забяспечваюцца фінансаваннем з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў у межах сродкаў, прадугледжаных у расходах адпаведных бюджэтаў.

3. Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь можа ўносіць змяненні ў:

даходы рэспубліканскага бюджэту ў межах гадавых паступленняў, якія прадугледжаны згодна з дадаткам 2;

расходы рэспубліканскага бюджэту па ведамаснай і эканамічнай бюджэтных класіфікацыях расходаў у межах гадавых асігнаванняў, якія прадугледжаны згодна з дадаткам 4, і па функцыянальнай класіфікацыі расходаў у частцы капітальных укладанняў і рэзервовых фондаў;

памеры крыніц фінансавання дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту, якія прадугледжаны згодна з дадаткам 1.

Артыкул 37. Устанавіць, што ў 2007 годзе:

1. Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь могуць прымацца рашэнні:

1.1. у парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, аб пакрыцці юрыдычным асобам (пазычальнікам) часткі працэнтаў за карыстанне банкаўскім крэдытам у межах расходаў на ўказаныя мэты, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на прамысловасць, развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці, рыбаводства і перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі, а таксама на іншыя агульнадзяржаўныя расходы:

па крэдытах, атрыманых у беларускіх рублях, — у памеры не больш як 50 працэнтаў стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, устаноўленай на дату пакрыцця працэнтаў;

па крэдытах, атрыманых у замежнай валюце, — у памеры не больш як 50 працэнтаў стаўкі па крэдыту;

1.2. аб выдзяленні з рэспубліканскага бюджэту сродкаў, прадугледжаных на фінансаванне расходаў, якія звязаны са стыхійнымі бедствамі, аваryямі і катастрофамі.

2. Грамадскім аб'яднанням можа аказвацца па рашэнню Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзяржаўная падтрымка з рэспубліканскага бюджэту ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

3. Дзяржаўная падтрымка ў выглядзе субсідый і (або) сродкаў на фінансаванне капітальных укладанняў юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам можа аказвацца з рэспубліканскага бюджэту ў парадку, які вызначаны заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, па рашэнню Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

4. Гранічны памер абавязацельстваў па дагаворах страхавання экспартных рызык з падтрымкай дзяржавы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня 2006 г. № 534 «Аб садзейнічанні развіццю экспарту тавараў (работ, паслуг)» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 143, 1/7870) складае ў эквіваленце 180 млн долараў ЗША.

Артыкул 38. У 2007 годзе Міністэрству фінансаў Рэспублікі Беларусь:

у выпадку парушэння мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ўстаноўленага заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадку залічэння падаткаў, зборaў і іншых абавязковых плацяжоў, іншых паступленняў у рэспубліканскі бюджэт прыпыняць або змяншаць перадачу з рэспубліканскага бюджэту сродкаў бюджэтам абласцей і г. Мінска;

у выпадку неабгрунтаванага атрымання або выкарыстання мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі не па мэтаваму прызначэнню або з парушэннем заканадаўства Рэспублікі Беларусь сродкаў, якія выдзелены з рэспубліканскага бюджэту, або існуючай запазычанасці па плацяжах у гэты бюджэт, уключаючы запазычанасць па бюджэтных пазыках, невыкананне рашэнняў Урада Рэспублікі Беларусь, прынятых у межах яго кампетэнцыі, ажыццяўляць пагашэнне (пакрыццё) такой запазычанасці за кошт сродкаў, якія перадаюцца з рэспубліканскага бюджэту ў бюджэты абласцей і г. Мінска;

ажыццяўляць залік падлягаючых выплаце ў рэспубліканскі бюджэт юрыдычнымі асобамі падаткаў, зборaў (пошлін), іншых абавязковых плацяжоў, запазычанасці па бюджэтных пазыках, выкананых гарантыях Урада Рэспублікі Беларусь па замежных крэдытах і крэдытах, выдадзеных банкамі Рэспублікі Беларусь юрыдычным асобам Рэспублікі Беларусь, а таксама налічаных пені, працэнтаў і штрафаў — у межах расходаў рэспубліканскага бюджэту, прадугледжаных указаным юрыдычным асобам.

Артыкул 39. Пералік будоўляў і аб'ектаў, якія фінансуюцца ў 2007 годзе за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту згодна з дадаткам 7, уключаючы аб'екты камунальнай уласнасці (за выключэннем аб'ектаў будаўніцтва (рэканструкцыі) дадатковай інфраструктуры аграрадкоў), Дзяржаўнай праграмы па пераадоленню наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 2006—2010 гады, а таксама за кошт рэспубліканскага фонду аховы прыроды, рэспубліканскага дарожнага фонду і дзяржаўнага пазабюджэтнага Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, вызначаюцца ў Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграме на 2007 год, якая зацвярджаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 40. У 2007 годзе:

1. Утвараць інавацыйныя фонды за кошт адлічэнняў у памеры не больш як 0,25 працэнта:

1.1. рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання (за выключэннем Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь і Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь), іншым дзяржаўным арганізацыям, якія падпрадкаваны Ураду Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, абласным і Мінскаму гарадскому выканаўчым камітэтам — ад сабекошту прадукцыі, тавараў (работ, паслуг) арганізацый, якія знаходзяцца ў іх падпарадкаванні (распараджэнні) (за выключэннем арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту (бюджэтных арганізацый)), гаспадарчых таварыстваў, якія не ўваходзяць у склад падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь арганізацый, акрамя гаспадарчых таварыстваў), якія адлічваюць сродкі ў інавацыйныя фонды, што ўтвараюцца рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі, падпрадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, Беларускім рэспубліканскім саюзам спажывецкіх таварыстваў, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі, Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі, грамадскімі аб'яднаннямі «Беларускае таварыства глухіх» і «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку»);

1.2. Міністэрству архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь — у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 жніўня 2006 г. № 499 «Аб некаторых мерах па аднаўленню асноўных сродкаў у будаўнічай галіне» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 127, 1/7828);

1.3. Міністэрству гандлю Рэспублікі Беларусь — ад сабекошту прадукцыі, тавараў (работ, паслуг):

арганізацый, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні (распараджэнні) Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь, у тым ліку гаспадарчых таварыстваў, у дачыненні да якіх Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь упаўнаважана кіраваць долямі (акцыямі), якія належаць дзяржаве;

арганізацый, якія ажыццяўляюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь аптовы і рознічны гандаль таварамі, за выключэннем тавараў, пералік якіх вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, а таксама дзейнасць па бытавому абслугоўванню насельніцтва і грамадскаму харчаванню, незалежна ад формаў уласнасці (за выключэннем арганізацый (акрамя гаспадарчых таварыстваў), якія адлічваюць сродкі ў інавацыйныя фонды, што ўтвараюцца рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі, падпрадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, Беларускім рэспубліканскім саюзам спажывецкіх таварыстваў, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі, Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі, грамадскімі аб'яднаннямі «Беларускае таварыства глухіх» і «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку»), які фарміруецца ва ўстаноўленым парадку арганізацыямі, што ажыццяўляюць аптовы і рознічны гандаль і дзейнасць па грамадскаму харчаванню, без уліку пакупнога кошту рэалізуемых тавараў, а арганізацыямі, якія ажыццяўляюць дзейнасць па бытавому абслугоўванню насельніцтва, — без уліку кошту матэрыялаў, якія аплачвае насельніцтва;

1.4. Беларускаму рэспубліканскаму саюзу спажывецкіх таварыстваў — ад сабекошту прадукцыі, тавараў (работ, паслуг) арганізацый спажывецкай кааперацыі;

1.5. Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі — ад сабекошту прадукцыі, тавараў (работ, паслуг) юрыдычных асоб, якія ўтвараюцца гэтай Федэрацыяй;

1.6. грамадскім аб'яднанням «Беларускае таварыства глухіх» і «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку» — ад сабекошту прадукцыі, тавараў (работ, паслуг) арганізацый, заснавальнікамі якіх з'яўляюцца гэтыя грамадскія аб'яднанні.

2. Устанавіць, што ў 2007 годзе:

2.1. павышаныя памеры адлічэнняў у інавацыйныя фонды вызначаюцца для:

Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь — не больш як 19 працэнтаў;

Міністэрства сувязі і інфар

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

5 студзеня 2007 г. № 1 (55)

АДНО АКНО

СЕЛЬСАВЕТ У ЭЛЕКТРОННЫМ ВАРЫЯНЦЕ

На Міншчыне актыўна выкарыстоўваюцца сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі

Афармленне патрэбных папер — справа неабходная, аднак не зусім, так бы мовіць, «камфортная». Так думалі многія яшчэ пэўны час таму. І мелі рацыю, паколькі ці не ў кожнага з нас быў асабісты сумны вопыт пакутлівага блукання па шматлікіх чыноўніцкіх кабінетах з мэтай атрымаць «сваю паперу». Было зразумела, што працэдуру трэба не тое што спрашчаць, а кардынальна змяняць у інтарэсах чалавека, радавога заяўніка.

Перакуліць такую «піраміду» ўяўлялася амаль немагчымай справай. Аднак планы і надзеі на лепшае нарэшце пачалі ўвасабляцца ў жыццё. Пачатак быў пакладзены вядомым указам кіраўніка дзяржавы № 432. Гэты дакумент з'явіўся ў верасні 2005 года, з таго часу і разгарнулася дзейнасць па змяненню стылю работы дзяржаўных установаў са зваротамі грамадзян. У сакавіку 2006-га ўказам №152 быў зацверджаны пералік адміністрацыйных працэдур, якія выконваюцца рознымі ўстановамі, куды людзі звяртаюцца з пытаннямі па афармленню неабходных папер. Усяго дакументам акрэслена 414 адпаведных працэдур, якія датычацца самых розных сфераў. Быў вызначаны максімальны тэрмін разгляду зваротаў людзей і выдачы патрэбных дакументаў, а таксама памер плацяжоў за тую ці іншую даведку.

Па сутнасці, праз «адно акно» пачалася перабудова ўсёй сістэмы па рабоце мясцовай улады з грамадзянамі. Цяпер шлях афармлення папер толькі пачынаецца ад заяўніка (з моманту звароту), а далей да справы актыўна падключаюцца чыноўнікі і дзяржаўныя ўстановы, прычым самых розных узроўняў. Удасканаленне сістэмы — канешне, справа не аднаго дня і нават года, аднак ужо цяпер бачны пэўныя змяненні.

— Многія пытанні зараз аператыўна і, галоўнае, эфектыўна вырашаюцца на месцы, — адзначае кіраўнік справамі Мінскага аблвыканкама Алег Крупенін. — Распрацавана дакладная методыка рэалізацыі прынцыпу «аднаго акна». Ёсць і неабходны інструментарый — што і як рабіць на тым ці іншым узроўні. Усе раённыя, гарадскія, пасялковыя і сельскія выканаўчыя камітэты забяспечаны патрэбнымі метадычнымі рэкамендацыямі як у папяровым, так і ў электронным варыянтах. Складзены падрабязны каталог электронных адрасоў органаў мясцовага самакіравання, дзяржаўных устаноў.

Тэхнічная база многіх сельскіх Саветаў аказалася непадрыхтаванай да кардынальных пераўтварэнняў. Пэўная іх колькасць увогуле не мелі электроннай тэхнікі. Таму адным з першых крокаў на шляху ўкаранення прынцыпу «аднаго акна» на Міншчыне стала сапраўдная «глабальная» камп'ютарызацыя. На гэта былі выдзелены значныя сродкі з абласнога бюджэту. Цяпер у кожным сельсавеце цэнтральнага рэгіёна ёсць камп'ютар — гэта, пагадзіцеся вялікая справа. Таксама наладжана факсімільная і мадэмная сувязь. Вясковы «ўрад» падключаны да электроннай пошты дзяржаўных устаноў.

Для забеспячэння сельскіх і пасялковых выканкамаў электроннымі копіямі эталоннага банка даных прававой інфармацыі з абласнога бюджэту выдзелена больш чым 12 мільёнаў рублёў. Усе такія меры скіраваны на адно — зрабіць працэдуру разгляду зваротаў грамадзян і афармлення патрэбных папер якаснай, аператыўнай і максімальна зручнай для чалавека. Пры жаданні можна многага дасягнуць, і гэтаму ўжо цяпер ёсць канкрэтнае пацвярджэнне. Узяць, да прыкладу, адну з традыцыйна вострых тэм — «камуналку». На многіх прадпрыемствах ЖКГ Мінскай вобласці патрэбныя даведкі могуць быць папярэдне заказаны жыхарамі (асабіста альбо нават па тэлефоне) з узгадненнем часу іх атрымання. Камунальнікі прыстаўлічнага раёна пайшлі далей — неабходную паперу, заказаную па тэлефоне, пасля праверкі інфармацыі чалавеку перасылаюць па пошце.

(Заканчэнне ў 2-й стар. «МС».)

СЦЯЖЫНКАМІ АДАМА МІЦКЕВІЧА

Старшыня Варанчанскага сельскага Савета Сяргей БАРАНАЎ.

Помнік архітэктуры XVIII стагоддзя — бровар, сённяшні спіртзавод.

НА ЎСКРАЙКУ Гродзеншчыны, амаль на памежжы з Брэсцкай вобласцю, сярод векавых калматых дрэў і шыкоўных садоў прытулілася вёсачка Варонча, што ў Карэліцкім раёне. Подых даўніны, простай, толькі злёгку кранутай часам самабытнасці адчуваеш у кожным куточку вёскі і наваколля. Ваеннае ліхалецце не пашкадавала панскую сядзібу — комплекс збудаванняў, куды ўваходзілі два палацы, скарбніца, флігелі, касцёл, гаспадарчыя пабудовы, невялікі парк. Уцалеў толькі бровар, помнік архітэктуры XVIII ст. Зараз тут месціцца спіртавы завод, дзе працуе значная частка вяскоўцаў.

Стваральнік школьнага музея, выкладчык гісторыі Дзмітрый Іванавіч АЛЕКСЯЕВІЧ і адзінаццацікласніцы Марына ЧАШЭЙКА і Насця ЛАЗАРЧЫК.

Упершыню Варонча ўпамінаецца ў судовых актах Вялікага княства Літоўскага ў 1576 годзе. Прыгажосць і адметнасць гэтай мясціны вабіла ў свой час вядомага этнографа і фальклярыста Адама Чарноцкага. Адам Міцкевіч узгадвае Варончу і заяводу Несялоўска-га, былога ўладальніка мясціны, у паэме «Пан Тадэвуш». Дарэчы, тут жылі бацькі вялікага, неаднойчы апетага кахання Міцкевіча — Марыі Верашчакі. На мясцовых могілках яны і пахаваны. Амаль што побач з бацькамі Марыі ляжаць родныя Яна Чачота. А самога знакамітага паэта хрысцілі ў тутэйшым касцёле Святой Ганны — выдатным помніку XVIII стагоддзя, якім ганарыцца Варонча.

Пра гэты куточак пісаў у «Зямлі пад белымі крыламі» Уладзімір Караткевіч, называючы яго вечным музеем.

Гэтыя цікавыя звесткі пра родны край па кропельцы збіраюцца ў музеі «Наша памяць», што створаны ў Варанчанскай сярэдняй школе выкладчыкам гісторыі Зміцерам Алексяевічам пры падтрымцы дырэктара школы Таісы Грыбок.

Варонча — цэнтр сельскага Савета. Старшыня яго Сяргей Баранаў з цікавасцю і ахвотай распавядзе пра час мінулы і сённяшні, пра людзей, іх праблемы і клопаты.

Зараз Варанчанскі сельсавет ахоплівае 13 вёсак з насельніцтвам, якое складае менш за тысячу чалавек. Асаблівасць мясцін у тым, што тут захавалася, акрамя вёсак вялікіх і малых, нямала хутароў. На жаль, гэты прыгожы і адметны куточак спасцігае лёс многіх беларускіх вёсачак. Яны старэюць. З 840 жыхароў працаздольных 364. А зусім адзінокіх пенсіянераў 204. Догляд гэтых немаладых, часам нямоглых людзей, як расказвае Сяргей Платонавіч, — адна з асноўных праблем старшыні сельскага Савета. Каб пажылыя людзі не адчувалі сябе адзінокімі і бездапаможнымі, ім аказваецца пасільная дапамога за сімвалічную плату ў падсадцы і зборы ўраджаю, нарыхтоўцы дроў, сена. Штогод пенсіянерам выдзяляецца па 100 кілаграмаў збожжавых па кошту нижэй закупачнага.

Насельніцтва таксама імкнецца аддзячыць мясцовыя ўлады. У мінулым годзе з прысядзібных гаспадарак дзяржавай закуплена 208 тон малака. Кожны гаспадар па магчымасці імкнецца добраўпарадкаваць сваю сядзібу, вуліцу. Сельскі Савет жа трымае ў полі зроку пытанні парадку на зямлі.

Высекчы залішняе кустоўе, пашыряць праезды, абкасіць, расчысціць мясцовыя азёры, закінутыя дамы, — вось кола вясковых клопатаў. З высоказатратных праблем пры дапамозе мясцовых уладаў удалося летась вырашыць дарожную. Цяпер з Варончы ў Мінакі і Раманы ехаць адно задавальненне, хоць бокам каціся — жартуюць вяскоўцы.

Штогод пад эгідай сельскага Савета праводзіцца конкурс па добраўпарадкаванню населеных пунктаў. Вяскоўцы, а асабліва старасты заўсёды з энтузіязмам рыхтуюцца да гэтых конкурсаўаглядаў. Яны ператвараюцца ў сапраўдныя святы. Вясковыя старасты — асноўная падтрымка і дапамога старшыні сельскага Савета, лічыць Сяргей Баранаў. І асноўная крыніца інфармацыі мясцовага жыцця.

— Без іх мне цяжка было б даведацца, што робіцца ў аддаленых вёсачках і хутарках, — гаворыць старшыня Савета. — Напрыклад, тэлефануе мне днямі стараста вёскі Равіны Соф'я Захарчук. Просіць дапамагчы ўладкаваць на зіму хворую 74-гадовую адзінокую бабульку на сацыяльны ложак. Канешне ж, дапаможам!

Мае «правыя рукі», — усміхаецца Сяргей Платонавіч, — гэта Ганна Васільеўна Сінкевіч, — стараста вёсак Раманы і Мінакі, Марыя Міхайлаўна Барысевіч — стараста ў вёсках Белыя Лугі, Салянікі, Ціневічы, Антон Адамавіч Шыкальскі, Міхаіл Міхайлавіч Пасюкевіч, Марыя Казіміраўна Маладзецкая.

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ.
Фота аўтара.

АДКРЫТЫ ФОРУМ

НА ТАННЫМ ПАПУЛІЗМЕ ВА ЎЛАДУ НЕ ЎСКОЧЫШ

У гэтыя дні, акрамя перадсвяточнай падрыхтоўкі, краіна была занята яшчэ адной, магчыма, не вельмі заўважанай на першы погляд, падзеяй... Да выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў засталіся лічаныя дні, і сёння кандыдаты, якія выйшлі на «фінішную прамую», вядуць перадвыбарную агітацыю... Але, як паказвае практыка, электарат падчас выбараў абапіраецца не толькі і не столькі на змест праграмы кандыдата, колькі на ўласную інтуіцыю і жыццёвы вопыт... Дык каго і па якіх крытэрыях будуць выбіраць людзі? Каму даверацца права вырашаць свае праблемы? З іншага боку, што сёння могуць дэпутаты мясцовых Саветаў, асабліва іх першага ўзроўню? І што перашкаджае ім працаваць больш эфектыўна? Гэтыя пытанні мы паспрабавалі абмеркаваць у рамках «Адкрытага форуму».

Галіна ХАРЫТОНАВА, старшыня Мінскага раённага Савета дэпутатаў:

— Асабіста я аддала б свой голас за кандыдата з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, за чалавека добрасумленнага, нацэленага працаваць творча. Натуральна, ён не павінен быць раўнадушным да праблем тэрыторыі, на якой пражывае. А яшчэ, думаю, выбіраць неабходна таго, хто ганарыцца сваёй краінай і настроены рабіць усё магчымае для яе працвітання.

У Мінскім раёне такія людзі, безумоўна, ёсць. І, што радуе, з кожным годам, з кожным скліканнем інтэлектуальны патэнцыял дэпутатаў расце, павышаецца іх актыўнасць. Мне здаецца, грамадства ў цэлым становіцца ўсё больш неабыякавым да дзяржаўных праблем. Па некаторых сельсаветах нашага раёна колькасць кандыдатаў на дэпутацкі мандат складае 5—7 чалавек — гэта сапраўдная канкурэнцыя, і ў ёй, спадзяюся, перамогуць самыя вартыя.

Што перашкаджае дэпутату працаваць? Ведаеце, калі шукаць і бачыць толькі перашкоды, іх можна дзе заўгодна знайсці. Калі думаць аб тым, як схавацца ад праблем, «спіхнуць» іх на кагосьці іншага, дык можна панаракаць і на няхватку паўнамоцтваў, і на дрэннае заканадаўства і г.д., і да т.п.

Але калі нацэліць сябе менавіта на вырашэнне праблемы, заўсёды знойдуцца і шляхі, і метады, і выйсце. Так што трэба шукаць не тое, што перашкаджае, а тое, што дапамагае.

Мікалай ЧЫРВА, старшыня Светлагорскага раённага Савета дэпутатаў:

— Выбіраць трэба таго, хто нацэлены на добразычлівасць, кансалідацыю, канструктывізм... Гэты чалавек не павінен баяцца называць рэчы сваімі імёнамі, таму што для яго інтарэсы выбаршчыкаў вышэй за ўсё. Варты выбрання той, хто разумее ролю і месца органаў мясцовага самакіравання ўсіх узроўняў і, атрымаўшы статус дэпутата, будзе адстойваць, прапагандаваць і ўдасканальваць гэту сістэму. Сярод асноўных якасцяў дэпутата я вылучыў бы прыстойнасць, чалавечнасць.

Выбіраючы дэпутата, многія думаюць: ну, зараз ён нам дарогу заасфальтуе, ваду правядзе, пад'езды добраўпарадкуе і г.д. Такі падыход няправільны. У дэпутата ў гэтым сэнсе ні эканамічных, ні фінансавых магчымасцяў няма. Адзінае, што дэпутат і можа, і павінен, і абавязаны — ставіць пытанні перад тымі людзьмі, якія адказваюць за іх вырашэнне, перад чыноўнікамі выканаўчай улады. Іншая справа, што дэпутат павінен падставіць выканаўчай уладзе плячо для вырашэння той ці іншай праблемы, тым больш што ён можа ініцыяваць прыняцце адпаведнага заканадаўчага дакумента на мясцовым узроўні, дапамагчы выканаўцам у арганізацыйным плане.

Савет дэпутатаў — гэта той орган, дзе акумулююцца ўсе праблемы выбаршчыкаў. Роля і задача дэпутатаў заключаецца ў тым, каб здолець іх сабраць, прааналізаваць, абагульніць і, калі неабходна, выйсці з заканадаўчай ініцыятывай на вышэйстаячыя структуры, аж да парламента.

Ад сябе асабіста хацеў бы пажадаць новаму дэпутацкаму корпусу працаваць у адзіным рэчышчы з выканаўчай галіной улады, але пры гэтым мець свой уласны твар, караскацца на сваю гару, саджаць свой сад... У процілеглым выпадку можа спыніцца развіццё мясцовага парламентарызму, а мясцовыя ўлады страцяць свой твар.

Святлана ДАВАЛЬЦОВА, старшыня Міханавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Мінскага раёна:

— Выбіраць трэба адукаваных, асабліва ў юрыдычным плане. Менш абяцанняў, больш рэальных спраў. Ідзі наперад і не спыняйся. Магчыма, спачатку гэта спадабаецца не ўсім, але ўрэшце людзі ацэняць табою зробленае.

Сярод тых, хто сёння ідзе ў дэпутаты, шмат людзей новай фармацыі і з іншай псіхалогіяй. Радуе, што многа моладзі: па нашаму сельсавету 80 працэнтаў кандыдатаў — людзі да 40 гадоў. Яны хочуць зрабіць жыццё лепшым, і для гэтага ў іх ёсць, лічу, асноўнае — доля добрага патрыятызму. Сённяшнія кандыдаты ў дэпутаты мясцовых Саветаў не толькі «агаляюць» праблему, але і прапаноўваюць шляхі яе вырашэння. Танны папулізм застаўся ў мінулым, на гэтым «коніку» ўскочыць ва ўладу сёння не так проста, як некалі.

На маю думку, галасаваць трэба за людзей мэтанакіраваных, настойлівых. У нас калектыў вылучыў кандыдатам маладога чалавека, супрацоўніка банка. Ён і жыве тут, і сем'янін добры, і спецыяліст адукаваны. «Што я буду рабіць?» — пытаецца. Адказваю: «Проста жыць жыццём людзей, якія вас вылучылі. А праблемы будзем вырашаць разам». Пагадзіўся. Хоць грошы за дэпутацтва не плацяць. З-за чаго ж тады людзі ідуць? Каб нешта адметнае зрабіць для сваёй маленькай радзімы, след пакінуць...

А перашкаджае дэпутатам... дэмагогія, гаварыльня. Часам перашкаджае кансерватызм, боязь перамен... Але ж калі няма веры ў тое, што ты можаш нешта змяніць, ці варта ісці ў дэпутаты?

Вольга ПЯТРОВІЧ, старшыня Бароўскага сельскага Савета дэпутатаў Лепельскага раёна:

— Я аддала б перавагу такім якасцям кандыдата ў дэпутаты, як прыстойнасць, добразычлівасць, актыўнасць, чуласць... Безумоўна, не на апошнім месцы павінен быць інтэлект... Што ж датычыцца пасады... У нас падчас выбараў многія аддаюць свой голас менавіта за кіраўнікоў. Уменне кіраваць людзьмі, працаваць з імі складваецца, выпрацоўваецца з цягам часу. Гэта, безумоўна, станоўчая складовая, але... не самая галоўная. Ёсць людзі, якія ніколі не былі кіраўнікамі, аднак выдатна спраўляюцца з дэпутацкімі абавязкамі. І наадварот. Чалавек у свой час займаў высокую пасаду і, калі стаў дэпутатам, з «вышыні» былых заслуг пачаў кіраваць усімі астатнімі. У выніку атрымалася, што ўсе яго ініцыятывы (тым больш з улікам няведання заканадаўства) толькі перашкаджалі агульнай справе.

Сёння людзі, якія даюць згоду балаціравацца ў дэпутаты, на мой погляд, ідуць на своеасаблівую рызыку — праверыць свой аўтарытэт сярод людзей. А быць дэпутатам сельскага Савета вельмі няпроста. Што могуць дэпутаты? Могуць падаваць дэпутацкія запыты па той ці іншай праблеме, могуць абмяркоўваць балючыя пытанні на сесіі. Асабліва адчувальная іх дапамога ў добраўпарадкаванні: дэпутаты і самі выходзяць на суботнікі і людзей паднімаюць. Канешне, вырашыць самастойна праблемы сваёй акругі яны не могуць (ды і часу многім не хапае), таму рана ці позна ўсё замыкаецца на сельвыканкаме. Хацелася б, каб дэпутаты больш актыўна карысталіся сваімі паўнамоцтвамі.

З асабістага вопыту зрабіла выснову, што працаваць з людзьмі становіцца ўсё больш складана. Але, як ні дзіўна, дрэннае забываецца хутка, а радасць ад зробленага для людзей застаецца надоўга.

Генадзь ЖУРЫД, старшыня Новасвержынскага сельскага Савета дэпутатаў Стаўбцоўскага раёна:

— Каго выбіраць дэпутатам? Адкажу, кіруючыся выключна жыццёвым вопытам і рэальным становішчам спраў. Пры нашай складанай эканамічнай сітуацыі, ва ўмовах адсутнасці грошай у сельвыканкамах даводзіцца рабіць стаўку на дэпутатаў-кіраўнікоў, якія могуць рэальна дапамагчы Савету справіцца з той ці іншай праблемай... Звычайнаму дэпутату, нават вельмі добраму і прыстойнаму, калі ён не кіруе якім-небудзь прадпрыемствам, складана вырашаць пытанні развіцця тэрыторыі. Да каго ён будзе звяртацца па дапамогу? Да таго ж кіраўніка, дырэктара, начальніка, таму што большасць пытанняў, што ўзнікаюць у выбаршчыкаў, «завязана» на фінансах, матэрыяльнай дапамозе. А ў нашых сельвыканкамаў, на жаль, няма ні таго, ні другога. Напэўна, таму на выбарах у пярвічнае звяно ўлады ў сельскай мясцовасці практычна няма конкурсу.

Канешне, калі дэпутат настырны і не лянуецца пастаянна хадзіць па «калідорах» больш высокіх уладных структур, «даставаць» увесь час старшыню райвыканкама, старшыню райсавета — нешта зрушыцца з месца. Але на гэта неабходна шмат сіл і нерваў. Галоўнае тут — пасля першай няўдачы не здацца, не схавацца ў кусты. Ведаю па дэпутатах мінулага склікання — многія, на каго ўскладвалі надзеі, пасля першай няўдачы страчвалі запал... Усё ўпіраецца ў няхватку фінансаў. Былі б у нас свае грошы — і статус мясцовай улады быў бы іншым.

Новаму дэпутацкаму корпусу я параіў бы не апускаць рукі... Пяць разоў торкнешся ў зачыненыя дзверы, а на шосты яны адчыняцца. Усё адразу не вырашыцца, але нешта зменіцца адназначна.

Гутарыла Наталля КАРПЕНКА.

УЛАДА Ў АСОБАХ

Уладзімір ПАНЦЮХОЎ:

«ПРАЦА НАД ПАМЫЛКАМІ ЎДАЛАСЯ»

Год таму Аляксандр Лукашэнка наведаў Шклоўскі раён, і ў ходзе гэтага візіту было прад'яўлена нямала прэтэнзій да працы розных сфер жыццядзейнасці. У цэнтры ўвагі аказаліся надзённыя праблемы людзей, пераадоленне валакіты і бюракратызму. Органам мясцовага самакіравання давялося рабіць сапраўдную «працу над памылкамі». Якія зрухі адбыліся за прайшоўшы год у гэтым накірунку, расказвае сёння старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ПАНЦЮХОЎ.

— Той візіт кіраўніка дзяржавы на Шклоўшчыну стаў вялікім штуршком да плённай працы. Мы ўбачылі, што ўсе структуры — спажывецкая кааперацыя, сфера культуры, ахова здароўя, сельскія Саветы — працуюць і імкнуцца вырашаць свае праблемы паасобку. Атрымлівалася, як у Крылова: лебедзь, рак і шчупак цягнуць у розныя бакі. І ўпершыню пратакол даручэнняў Прэзідэнта і мерапрыемствы аблвыканкама ўвязалі ўсе структуры ў адну агульную «карцінку», у якой знайшлося месца і для органаў мясцовага самакіравання. Цяпер у Магілёўскай вобласці мы імкнёмся ў сельскай мясцовасці размяшчаць побач усе службы. Такая мадэль, каб у адным будынку быў сельскі Савет, пошта, пакой бытавога абслугоўвання, кабінет участковага і крама. Прасцей дабівацца выніку, калі ўсе знаходзяцца разам.

(Заканчэнне ў 2-й стар. «МС».)

«МС» ВЫСТУПІЛА. МЯСЦОВЫЯ ЎЛАДЫ АДРЭАГАВАЛІ

БУДЕТ РЕЗЕРВ?

22 ноября в «МС» была опубликована статья «Спартанские условия для спортсменов» — о фактически нищенском существовании детской спортивной школы олимпийского резерва в городе Дубровно Витебской области.

Статья была отправлена на реагирование в соответствующие инстанции. На днях редакция получила ответ из Витебского областного исполнительного комитета, где сообщается, что вопросы, поднятые в статье «Спартанские условия для спортсменов», опубликованной 22 ноября 2006 г. в газете «Звязда», изучены с выездом на место. В настоящее время Дубровенской специализированной детско-юношеской школе олимпийского резерва выделено дополнительное помещение для отделения борьбы. Определен перечень необходимого спортивного инвентаря и оборудования, на приобретение которого в течение 2007 года управлением образования облисполкома будет выделено 45 млн рублей.

Согласно решению Дубровенского райисполкома от 16.03.2006 г. № 244, для укрепления материальной базы СДЮШОР предусмотрено выделение 25 млн рублей на ремонт спортсооружений и приобретение спортинвентаря.

В соответствии с решением Витебского облисполкома от 26.01.2006 г. «О дополнительных мерах по развитию видов спорта, спортивного резерва и модернизации спортивной базы» в 2007 году планируется капитальный ремонт городского стадиона. В настоящее время готовится проектно-сметная документация.

ВЫБАР БЕЛАРУСІ

9 СТУДЗЕНЯ ПАЧЫНАЕЦЦА ДАТЭРМІНОВАЕ ГАЛАСАВАННЕ

АРГАНІЗАТАРЫ выбараў у мясцовыя Саветы вырашаюць сёння пытанні па друкаванню выбарчых бюлетэняў, а таксама па іх дастаўцы не пазней за 8 студзеня на ўсе выбарчыя ўчасткі краіны. Аб гэтым паведаміў сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай ЛАЗАВІК.

Яшчэ адно арганізацыйнае пытанне, якое цяпер вырашаецца, — удакладненне спісаў выбаршчыкаў. «Згодна з заканадаўствам, спісы рыхтуюць выканаўчыя камітэты раёнаў і адміністрацыі раёнаў у гарадах. Яны павінны дамагчыся таго, каб спісы па кожнаму ўчастку дакладна адлюстроўвалі склад выбаршчыкаў, каб не было «мёртвых душ», каб не былі прапушчаны выбаршчыкі. І за два тыдні да дня выбараў спісы перадаюцца ва ўчастковыя выбарчыя камісіі, якія павінны дадаткова ўдакладніць спісы. Пры гэтым камісіі павінны даць магчымасць любому выбаршчыку, які звернецца да іх, праверыць, ці ўключаны ён у спісы. Калі не ўключаны, неабходна выправіць гэтую памылку. І кожны грамадзянін, які ўключаны ў спісы, мае права праверыць правільнасць звестак, пазначаных пра яго ў іх», — сказаў Мікалай Лазавік.

8 студзеня Цэнтрвыбаркам мае намер праверыць гатоўнасць выбарчых участкаў і выбарчых камісій усіх узроўняў да правядзення галасавання. «Дата правядзення такой праверкі не выпадковая. Яна праводзіцца за дзень да пачатку датэрміновага галасавання. Арганізатары выбараў павінны праверыць, як абсталяваны ўчасткі, ці маецца дастатковая колькасць аргтэхнікі. Але самае галоўнае, на чым мы будзем акцэнтаваць увагу, — гэта надзейнасць усіх ліній сувязі».

Цяпер жа кандыдаты ў дэпутаты працягваюць весці агітацыйную кампанію. Пры гэтым сакратар Цэнтрвыбаркама выказаў меркаванне, што падчас навагодніх святаў агітацыя ў краіне магла амаль не весціся. «Аднак па меры набліжэння даты выбараў напружанне перадвыбарнай барацьбы будзе ўзрастаць і агітацыйная работа будзе актывізавацца».

Сур'ёзная скарга з боку кандыдатаў у дэпутаты наконт праблем пры вядзенні агітацыйнай кампаніі, паводле слоў Мікалая Лазавіка, у Цэнтрвыбаркам паступіла толькі адна. Перад Новым годам адзін з кандыдатаў у дэпутаты Мінгарсавета звярнуўся з паведамленнем аб тым, што ў Мінску было вельмі складана размясціць заказ на выданне плакатаў і лістовак. «Гэта сапраўды было так, бо многія друкарні былі перагружаны перадсвяточнымі заказамі. Напэўна, пасля Новага года загрузка значна зменшыцца. Да таго ж, мы звярнуліся ў Міністэрства інфармацыі з прапановай аб тым, каб матэрыялы, якія будуць выдавацца альбо камісіямі, альбо кандыдатамі, прымаліся друкарнямі для друку без адтэрмінаванняў».

З 9 студзеня да дня выбараў (14 студзеня) будзе праходзіць датэрміновае галасаванне. Мікалай Лазавік адмовіўся рабіць прагноз адносна магчымай яўкі выбаршчыкаў падчас датэрміновага галасавання. «Цэнтрвыбаркам ніколі не прагназуе яўку. Гэта даволі няўдзячная справа. Цэнтрвыбаркам не займаецца нейкімі прагнозамі, мы канстатуем факты...»

У той жа час сакратар Цэнтрвыбаркама адзначыў, што датэрміновае галасаванне — гэта «вельмі дэмакратычная норма, якая дазваляе выбаршчыку нават у тым выпадку, калі ён у дзень выбараў не зможа прыйсці на выбарчы ўчастак, рэалізаваць сваё выбарчае права. Гэтая практыка пашыраецца ва ўсіх краінах Еўропы і Амерыкі. Больш за тое, АБСЕ нават рэкамендуе краінам пашыраць практыку датэрміновага галасавання».

«Мы таксама выкарыстоўваем дадзеную форму галасавання, каб аказаць садзейнічанне грамадзянам у рэалізацыі выбарчага права. Але мы лічым, што ўмовы для датэрміновага галасавання ў першую чаргу трэба ствараць у гарадах, дзе шмат выбаршчыкаў у дзень выбараў не знаходзяцца на месцы свайго пастаяннага пражывання. Так, падчас маючых адбыцца выбараў студэнты раз'едуцца на выхадныя (тым больш, што датэрміновае галасаванне прыпадае на перыяд заканчэння сесій), маладыя рабочыя, якія пражываюць у інтэрнатах, на стары Новы год хочуць, мабыць, паехаць да сваіх сваякоў. Ды і многія іншыя жыхары гарадоў з'яўляюцца мабільнымі і ў дзень святкавання старога Новага года пажадаюць паехаць да сваякоў у іншыя населеныя пункты. А ў сельскай мясцовасці, дзе насельніцтва менш мабільнае, фарсіраваць датэрміновае галасаванне не трэба».

Выбары ў мясцовыя Саветы павінны стаць апошнімі выбарамі для сённяшняга складу Цэнтрвыбаркама. Справа ў тым, што паўнамоцтвы цяперашняга складу канчаюцца 31 студзеня. Згодна з заканадаўствам, 6 членаў Цэнтрвыбаркама новага складу да 31 студзеня павінен прызначыць Прэзідэнт Беларусі, яшчэ 6 — Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Усе кандыдатуры членаў Цэнтрвыбаркама вылучаюць прэзідыумы абласных Саветаў, Мінгарсавета і адпаведныя выканкамы.

У канцы 2006 года Прэзідэнт Беларусі прызначыў 6 членаў новага складу Цэнтрвыбаркама (у тым ліку Мікалая Лазавіка і старшыню Цэнтрвыбаркама Лідзію Ярмошыну). Усе яны з'яўляюцца членамі дзеючага сёння складу.

Дата правядзення пазачарговай сесіі Савета Рэспублікі пакуль не абвешчана. «Аднак да 31 студзеня такая сесія павінна прайсці. Паўнамоцтвы новага складу Цэнтрвыбаркама пачынаюцца з моманту правядзення першага арганізацыйнага пасяджэння», — паведаміў Мікалай Лазавік. Ён дадаў пры гэтым, што сярод 6 кандыдатур, вылучаных для зацвярджэння членамі Савета Рэспублікі, толькі адзін чалавек з'яўляецца членам цяперашняга складу Цэнтрвыбаркама.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

«ПРАЦА НАД ПАМЫЛКАМІ ЎДАЛАСЯ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Калі гаварыць агулам, ці ўдалося Магілёўскай вобласці, мясцовым Саветам дэпутатаў, сельвыканкамам на месцах паспяхова пераадолець памылкі?

— Многія змянілі падыход да працы, нават светапогляд. І гэта зразумела, бо паварот дзяржавы да чалавека датычыцца ўсіх чыноўнікаў.

— На парадку дня паўстала распрацоўка палажэння аб старшыні сельвыканкама. Наколькі гэты нарматыўны акт дапаможа ў працы на месцах?

— Адназначна дапаможа. Праўда, палажэнне яшчэ не прынята, праца ідзе. У мяне ёсць 11 рэдакцый гэтага дакумента, і ў кожную мы ўносілі свае прапановы. У палажэнні аб старшыні сельвыканкама будуць прапісаны ўсе дэталі працы і адзін дзяржаўны ўзровень патрабавальнасці. Для каардынацыі органаў мясцовага самакіравання будзе створаны рэспубліканскі савет, у якім возьмуць удзел прадстаўнікі ўсіх узроўняў: ад дэпутатаў сельскіх Саветаў да парламентарыяў. Яны будуць вывучаць інфармацыю з месцаў і падаваць кіраўніцтву краіны прапановы розных напрамкаў. Напрыклад, пра матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне сельскіх Саветаў.

— Гэта актуальнае пытанне. Каб добра працаваць, патрэбны падмурак — матэрыяльная база. Ці ўдалося сёлета забяспечыць тэхнікай і транспартам сельскія Саветы?

— Год таму мы расказалі, што ў многіх Саветах з усёй тэхнікі ёсць толькі машына для друкавання «Ятрань». Гэта не проста ўчарашні, а пазаўчарашні дзень. І толькі прыкладна ў пятай частцы сельскіх Саветаў былі камп'ютары. І як працаваць? Што ў такой сітуацыі рабіць з сацыяльнымі стандартамі, «адным акном»? А дырэктыва № 2 цяпер патрабуе ліквідаваць чэргі і бюракратычныя замарочкі.

Мы здолелі за гэты год шмат чаго зрабіць. Усе старшыні Саветаў, дзе ёсць зона пакрыцця, атрымалі мабільныя тэлефоны. І ва ўсіх сельскіх Саветах з'явіліся тэлевізары. Таксама зрабілі сур'ёзныя крокі на шляху абнаўлення аўтатранспарту. І цяпер па выніках 2006 года ў кожны сельскі раён набылі па новаму аўтамабілю: іх, як заахвочванне, атрымаюць тыя Саветы, якія лепей спрацавалі. У мінулым месяцы быў праведзены тэндар, ужо аплачана камп'ютарная тэхніка для кожнага сельскага Савета ў вобласці. Усе атрымаюць новыя камп'ютары.

— Увесь мінулы год у «Местном самоуправлении» кіраўнікі мясцовых Саветаў дэпутатаў расказвалі, што для нармальнай працы ім патрэбны таксама дадатковыя штатныя адзінкі і большы бюджэт. Што з такіх прапаноў ажыццёвіцца ў 2007 годзе?

— Паводле прынятых бюджэтаў, кожны сельвыканкам атрымае пэўную суму грошай адпаведна з пададзенымі раней свамі падлікамі таго, колькі патрэбна на добраўпарадкаванне, рамонт будынкаў і гэтак далей. Сродкаў будзе выдаткавана ў некалькі разоў больш, чым летась.

Што датычыцца штатнага раскладу, то апетыты былі вялікія — аж да 7 супрацоўнікаў, але не трэба забывацца пра лінію кіраўніка дзяржавы на скарачэнне апарату. Мяркую, што ў кожным сельскім Савеце павінна працаваць як мінімум тры чалавекі: старшыня, сакратар і тэхнічны супрацоўнік. А далей — па сітуацыі, хоць заробак супрацоўнікаў Савета будзе знаходзіцца ў прамой залежнасці ад іх колькасці, а прэмія — ад вынікаў працы.

— Людзі, якія жывуць у вёсках, аддаленых ад цэнтраў сельскіх гаспадарак, маюць вострую патрэбу ў дапамозе ў апрацоўцы зямельных участкаў, нарыхтоўцы дроў і гэтак далей, і яны гатовыя плаціць за паслугі. Так, у Клімавіцкім раёне стварылі прадпрыемства «Сяляне», якое займаецца гэтай справай. Ці запатрабаваны гэты вопыт у вобласці?

— Гасразліковае механізаванае звяно павінна дапамагчы людзям пасеяць і ўбраць, прывезці дровы, падрэзаць аварыйныя дрэвы, зрабіць агароджу і вырашыць многія іншыя праблемы вяскоўцаў. У розных месцах у пераліку такіх паслуг ужо значыцца да двух дзесяткаў пунктаў.

Актыўна механізаванымі звеннямі займаюцца ў Клімавіцкім і Шклоўскім раёнах. Мы ім дапамаглі з тэхнікай. Улада лічыць гэта добрай справай, але навязваць менавіта гэтую схему сельскім раёнам не будзе. Гэта сфера паслуг у такім выглядзе толькі пачынае развівацца, і будучае пакажа, якая яе форма больш зручная для людзей. Мне падаецца, што механізаваныя звенні ў першую чаргу будуць запатрабаваныя там, дзе вялікая раскіданасць малых вёсак. Туды нявыгадна ехаць кааператарам і пра іх не будзе клапаціцца гаспадарка, якая спачатку глядзіць цэнтральныя сядзібы. А гэтыя звенні даедуць да самых далёкіх і адзінокіх.

— Калі гутарыш з вяскоўцамі пра надзённыя праблемы, то атрымліваецца, што кола іх інтарэсаў традыцыйна абмяжоўваецца нарыхтоўкай паліва, прыездам аўталаўкі і медыцынскім абслугоўваннем. Ці вызначаны для кожнага населенага пункта парадак бытавога, гандлёвага і медыцынскага абслугоўвання? Ці ўсё цяпер у парадку, прынамсі, з работай стаматалагічнай службы ў Шклоўскім раёне, на якую было шмат нараканняў год таму?

— Усё цяпер арганізавана добра і талкова. Дарэчы, паводле вынікаў 2006 года, платныя паслугі стаматалогіі ў Шклоў-скім раёне павялічыліся ў 2,5 раза. Ды і ўвесь пералік паслуг — бытавых, культурных, медыцынскіх і спажывецкай кааперацыі — сёння знаходзіцца на дастатковым узроўні, і за гэта не сорамна. І не толькі ў Шклоўскім раёне. Хоць, канешне, Шклоў-шчына — гэта наша «перадавая», там выпрабоўваецца новы вопыт. І там ёсць што паказаць людзям — напрыклад, аграгарадок Аляксандрыю. Але такія ёсць і яшчэ будуць будавацца і ў іншых сельскіх раёнах.

> У кожным сельскім Савеце павінна працаваць як мінімум тры чалавекі: старшыня, сакратар і тэхнічны супрацоўнік. А далей — па сітуацыі, хоць заробак супрацоўнікаў Савета будзе знаходзіцца ў прамой залежнасці ад іх колькасці, а прэмія — ад вынікаў працы

— Пасля шклоўскага візіту Прэзідэнта ў вашых планах было інспекцыйнае абследаванне вёсак, каб вывучыць грамадскае меркаванне і ацаніць якасць жыцця. Што яно дало?

— Пры абследаванні вёсак мы рабілі сацыялагічнае даследаванне грамадскага меркавання. Першае было год таму, адразу пасля візіту, і яно выявіла і незадаволенасць працай Саветаў, і цэлыя накірункі недапрацовак, і проста недавер людзей мясцовым органам улады: маўляў, яны тут сядзяць «для галачкі». А цяпер мы прымеркавалі новае даследаванне да выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў. Хацелі даведацца, што думаюць людзі, а таксама зразумець, ці пойдуць яны галасаваць.

Можна сказаць, што сітуацыя вакол сельвыканкамаў змянілася, яны настроіліся на патрэбныя для людзей справы і лагічна, што ва ўладу паверыць. І можа, няма ў нас вялікай альтэрнатывы на выбарах 14 студзеня, але ў дэпутаты вылучалі менавіта тых, каго добра ведаюць і паважаюць людзі.

Справаздачы дэпутатаў усіх узроўняў перад народам сталі адной з форм працы. Яшчэ больш актыўна праводзяцца дні сельсаветаў. Да гэтай падзеі адказна рыхтуюцца два бакі: і госці, якія едуць з раёна і вобласці, і гаспадары.

— Год таму ў сваім каментарыі да працы над «шклоўскімі памылкамі» вы казалі, што ёсць такія старшыні Саветаў, якія працуюць так даўно, што «параслі мохам». Ці адбылася змена кадраў? І, паводле прагнозаў, наколькі абновяцца кіраўнікі мясцовых Саветаў пасля выбараў 14 студзеня?

— За мінулы год прыкладна пятая частка кадраў у органах мясцовага самакіравання змянілася. Увогуле дэпутацкі корпус павінен абнавіцца пасля новых выбараў больш чым напалову.

У 6—7 раёнах чакаецца абранне новых старшынь райсаветаў. Да кіраўнікоў сельвыканкамаў прад'яўляецца цяпер нямала патрабаванняў, першае з якіх — адукаванасць. Чалавек павінен мець вышэйшую адукацыю. І яшчэ — наяўнасць канкурэнцыі. Калі справа дойдзе да выбараў старшынь сельскіх і раённых Саветаў, акрамя асноўнай кандыдатуры, павінны быць яшчэ дзве альтэрнатыўныя. Калі чалавек адчуе, што гэта — не яго «вотчына», а адказная праца, на якую прэтэндуюць і іншыя людзі, будзе вынік. Больш таго, ад кандыдатаў на пасады кіраўнікоў органаў мясцовага самакіравання мы запатрабуем складзі своеасаблівы творчы бізнэс-план, які трэба будзе абараніць перад тымі, хто будзе вырашаць — абіраць яго на пасаду старшыні альбо не. Так што абнаўленне будзе значным, але практыка паказвае, што маладыя людзі, якія прыйшлі ў мясцовыя Саветы, працуюць не горш за сваіх сталых і вопытных папярэднікаў, а часам і больш самаддана.

Я памятаю, што пасля рабочай паездкі Прэзідэнта па вобласці, я раіў калегам зняць руховыя акуляры, азірнуцца і зразумець, што Саветы існуюць для людзей, а не наадварот. Гэта па-ранейшаму актуальная парада.

— Ці ўдалося ў выніку «працы над памылкамі» выканаць галоўную задачу — дайсці да кожнага чалавека з яго патрэбамі?

— Не маю права сказаць, што ўсё ўдалося да канца. Але ж гэта тая праца, якая ніколі не заканчваецца. Трэба імкнуцца да гэтай задачы пастаянна. Сельскія Саветы бліжэй за ўсё да народа.

Таму я запрашаю ўсіх прыйсці на выбары 14 студзеня і аддаць свае галасы за самых дастойных кандыдатаў. Трэба паверыць, што гэтыя абраннікі зробяць новыя крокі наперад, каб у людзей стала менш праблем і каб вярнуць ім упэўненасць у заўтрашнім дні.

Гутарыла
Ілона ІВАНОВА.

СЕЛЬСАВЕТ У ЭЛЕКТРОННЫМ ВАРЫЯНЦЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У Салігорску працуе спецыяльны разлікова-даведачны цэнтр, які аказвае цэлы комплекс паслуг. На васьмі прадпрыемствах жыллёва-камунальнай гаспадаркі працуе адзіны асабісты рахунак па «кватэрных» плацяжах. Яшчэ 10 «жылкантор» заключылі дагаворы з ААБ «Беларусбанк» аб выдачы інфармацыі аб жыллёвых умовах, складзе сям'і для прадастаўлення льготных крэдытаў і г.д. Ва ўсіх ЖЭСах, якія ўваходзяць у склад унітарнага прадпрыемства «Жыллё», што працуе ў Барысаве, ёсць унутраная інфармацыйная інфраструктура кшталту карпаратыўнай сеткі. Такое «ноўхау» зноў-такі дазваляе своечасова вырашаць надзённыя праблемы людзей.

Таксама і з зямельнымі пытаннямі. У Мінскім абласным агенцтве па дзяржаўнай рэгістрацыі ўстаноўлена праграмнае забеспячэнне па кантролю за выкананнем заказаў, што прымаюцца праз «адно акно». Гэта дазваляе аператыўна праводзіць электронны абмен інфармацыяй з праектным інстытутам «Белгіпразем» і з іншымі землеўпарадкавальнымі арганізацыямі. Каб больш хутка вырашаць патрэбныя пытанні людзей, набыта 9 аўтамабіляў, якія ў адпаведнасці са спецыяльным графікам абслугоўваюць усе «зямельныя» бюро Міншчыны.

Такім чынам, сэрвіс у шэрагу месцаў рэальна ўдасканальваецца. Гэта адзін з «плюсаў» укаранення прынцыпу «аднага акна». Таксама як і павышэнне кваліфікацыі адказных спецыялістаў. Адначасова з паляпшэннем матэрыяльна-тэхнічнай базы давялося арганізоўваць іх навучанне.

— У першую чаргу гэта датычылася спецыялістаў, якія працуюць у сельскіх выканкамах, — адзначае Алег Крупенін. — Менавіта на гэтым узроўні кадрам востра не хапала патрэбнай кваліфікацыі. Арганізавалі спецыяльныя курсы, праз якія прайдуць работнікі 217 з 322 сельсаветаў Міншчыны. Асобныя раёны (Нясвіжскі, Маладзечанскі, Стаўбцоўскі) наладзілі навучанне на месцы. Упэўнены, што пасля такога масавага павышэння кваліфікацыі адчувальна палепшыцца якасць работы, рэальная аддача. Усе ўзроўні ўлады будуць працаваць па сучасных тэхналогіях. Для гэтага сёння створаны ўсе перадумовы.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

РЭАНІМАВАЛІ РЭАНІМАЦЫЮ, АДРОДЗІМ І РАДЗІЛЬНАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

У Круглянскай раённай бальніцы ідзе капітальны рамонт і рэканструкцыя аперацыйна-рэанімацыйнага аддзялення. Работы актыўна вядуцца з лістапада, і напярэдадні Новага года завершана будаўнічая частка.

У памяшканнях заменены аконныя і дзвярныя блокі, усталяваны кандыцыянеры, зроблена новая столь і антыстатычная паркетная падлога. Усё зроблена з самых сучасных матэрыялаў, якія пры гэтым адпавядаюць усім санітарным нормам.

У выніку рэканструкцыі і рамонту ў Круглянскай бальніцы будуць дзве аперацыйныя (раней была толькі адна) і з'явіцца новае рэанімацыйнае аддзяленне на 4 месцы з кругласутачным пастом нагляду за цяжкімі хворымі.

Цяпер у бальніцы робяць мантаж разводкі лячэбных газаў і ўсталёўваюць новую медтэхніку. Чакаецца, што агульны кошт новага абсталявання, пастаўленага ў Круглае, складзе да 500 мільёнаў рублёў. Гэта будзе кампрэсарная станцыя, сучасныя маніторы для нагляду за станам пацыентаў, апаратура для штучнай вентыляцыі лёгкіх і іншае.

У бальніцы таксама ўдзячныя Круглянскаму райвыканкаму, які выдаткаваў на рамонтна-будаўнічыя работы 300 мільёнаў рублёў.

— Для нашага маленькага раёна новы аперацыйны блок і рэанімацыя — вялікая і вельмі патрэбная справа, — гаворыць галоўны ўрач Круглянскай ЦРБ Іна Турко. — Таму што любы грамадзянін, дзе б ён ні жыў — у вялікім горадзе ці ў малой вёсцы, павінен мець магчымасць атрымаць якасную медыцынскую дапамогу ў дастойных умовах.

Дарэчы, некалькі гадоў таму ў райцэнтры было скасавана радзільнае аддзяленне, і цяпер жыхаркі Кругляншчыны едзяць раджаць у суседнія Бялынічы і Магілёў. Аднак, паведаміла Іна Турко, нараджальнасць у раёне павялічылася. За 2006 год у раёне нарадзілася больш за 150 дзяцей, і гэта прыкладна на чвэрць сотні болей за год папярэдні. Таму ў Круглым спадзяюцца, што ў сувязі з дзяржаўнай праграмай дэмаграфічнай бяспекі ў раённай бальніцы ў будучым адродзіцца і радзільнае аддзяленне для жанчын.

Алена КАЗЛОВА.

НАВАГОДНІ ПАДАРУНАК

У сельгаспрадпрыемстве «Саўгас «Дубавіцкі» Буда-Кашалёўскага раёна думаюць не толькі аб павышэнні эфектыўнасці вытворчасці.

Як расказаў нам старшыня райсавета дэпутатаў Аляксандр Галіцкі, дзякуючы кіраўніку гаспадаркі Васілю Кабаеву тут кожны год ствараецца хакейная пляцоўка, дзе не толькі трэніруецца і набірае майстэрства мясцовая каманда, а і адбываюцца хакейныя паядынкі з удзелам спартсменаў з іншых гаспадарак.

Праўда, не ўсе хакеісты мелі раней належную хакейную форму. Праблему дапамог вырашыць дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір Кужанаў, які напярэдадні Новага года падарыў хакейнай дружыне саўгаса дзесяць камплектаў адзення. Ударыў бы толькі мароз...

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ЕСЛИ ТЫ ДЕПУТАТ

ПОЧЕТНАЯ ПРИВИЛЕГИЯ ИЛИ НЕЛЕГКИЙ ТРУД?

СОГЛАСНО статье 3 Конституции Республики Беларусь, единственным источником государственной власти и носителем суверенитета в Республике Беларусь является народ.

Народ осуществляет свою власть непосредственно через представительные и иные органы в формах и пределах, определенных Конституцией.

Представительными государственными органами на территории соответствующих административно-территориальных единиц республики — сельсовета, поселка, города, района, области — являются местные Советы депутатов (далее — местные Советы, Советы).

Единую систему местных Советов составляют сельские, поселковые, городские, районные и областные Советы депутатов. Их тесная связь с избирателями, подотчетность и подконтрольность народу — вот один из важнейших демократических принципов организации и деятельности местных Советов депутатов. Они отличаются от всех других массовых организаций тем, что сочетают в своей деятельности как государственные, так и общественные начала, являются самой массовой организацией народа, воплощением его единства.

Будучи частицей государственной власти, любой местный Совет наделен полномочиями решать вопросы, отнесенные к его компетенции, и вместе с тем он выступает как проводник общегосударственных интересов.

В лице местных Советов депутатов, избираемых путем всеобщих выборов сроком на четыре года, сам народ осуществляет государственную власть, руководит государственным, хозяйственным и социально-культурным строительством на территории области, города или района, поселка или села.

Следует отметить, что местные Советы депутатов действительно народные органы власти. Об этом свидетельствует прежде всего их состав. Советы, как правило, вбирают в себя лучших представителей всех слоев и социальных групп населения. Среди них специалисты народного хозяйства, работники науки, культуры, юристы, представители творческой интеллигенции. Такой состав местных Советов позволяет им компетентно решать любые государственные вопросы.

Местные Советы осуществляют свою деятельность через сессии, постоянные и временные комиссии и другие органы Совета, а также путем реализации депутатами своих полномочий.

Местный Совет депутатов — коллегиальный орган. А это значит, что успех, эффективность работы Совета в целом зависит от того, как хорошо, добросовестно, организованно будет работать каждый избранный в этот Совет депутат.

Требования и обязанности

Депутатом местного Совета депутатов является свободно избранный гражданами, проживающими на территории, входящей в избирательный округ, представитель, уполномоченный участвовать в осуществлении государственной власти местным Советом депутатов, представлять своих избирателей в государственных органах и других организациях, осуществлять иные полномочия, предусмотренные Конституцией страны, Законом «О статусе депутата местного Совета депутатов» и другими актами законодательства Республики Беларусь.

Депутатом местного Совета может быть избран гражданин Республики Беларусь, достигший 18 лет. Срок полномочий депутата — четыре года.

Быть депутатом представительного органа власти — большая честь. Вместе с тем народ предъявляет к своим избранникам высокие требования, возлагает на них важные государственные и общественные обязанности. От работы депутатов, их активной позиции, гражданской заинтересованности, умения аккумулировать и выражать волю избирателей, действовать с государственных позиций, во многом зависят наши успехи в экономическом, социально-политическом и духовном развитии, укреплении и совершенствовании государственности.

Всей своей деятельностью депутат должен оправдывать доверие избирателей, всегда быть на уровне требований, предъявляемых к нему народом. Где бы он ни работал, какой бы пост ни занимал, он должен служить образцом добросовестного, полного и четкого выполнения конституционных требований.

Дальнейшее улучшение всей деятельности Советов депутатов находится в прямой зависимости от более полного воплощения в жизнь Закона «О статусе депутата местного Совета депутатов», который определяет его полномочия, устанавливает основные правовые и социальные гарантии их осуществления.

Депутат — член Совета, и в этом качестве он активно участвует в осуществлении Советом государственной власти, во всей его работе. Участвуя в работе Совета и его органах, депутат обсуждает и решает вопросы государственного, хозяйственного и социально-культурного строительства, участвует в подготовке и принятии решений Совета, контролирует исполнение законов, других актов вышестоящих органов государственной власти и управления республики, а также решений Совета, осуществляет контроль за работой расположенных на территории Совета государственных и общественных органов, предприятий, учреждений и организаций.

Депутат строит свою работу в соответствии с законодательством, решениями местного Совета и своей предвыборной программой.

Все свои усилия депутаты должны сосредоточить на осуществлении задач, поставленных государством, призваны еще более активно влиять на развитие экономики и культуры, уделять неослабное внимание благоустройству городов и сел, улучшению образования, здравоохранения, торговли и бытового обслуживания, укреплению законности и правопорядка, защите прав граждан.

Александр ГРОСЮКОВ.

(Продолжение в следующем номере «МС»).

МЯСЦОВЫ ЧАС

СТАРЫЯ ДРЭВЫ — ПАД ПІЛУ

Не так даўно са старшынёй Рагачоўскага раённага Савета дэпутатаў Мікалаем Кожанавым наведаў вёску Побалава. На адной з вуліц заўважыў некалькі таўшчэзных, мабыць, у цэлых тры абхваты, таполяў. «Пэўна, іх яшчэ да рэвалюцыі садзілі, — заўважыў Мікалай Кожанаў, — паглядзіце, якія яны старыя, з прагніўшымі дупламі. Няма сумнення, што пры моцным ветры такія дрэвы могуць нарабіць бяды. Таму іх лёс прадвызначаны — адправіцца пад пілу і сякеру».

Таго, хто выконвае гэту работу, сустрэлі на суседняй вуліцы: супрацоўнікаў раённага аддзела Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Юрыя Бохана, Дзмітрыя Расола і Аляксандра Габруся. Капітан Бохан, кіраўнік групы, расказаў нам (і паказаў таксама), якая гэта складаная працэдура — зносіць такія таўшчэзныя і высачэзныя дрэвы. Бо растуць яны на вуліцы, побач з дамамі і іншымі пабудовамі. А тут жа і лініі сувязі праходзяць, і электралініі, а агароджы — дэкаратыўныя, з жалезабетону, дарагія па кошту. Працаваць трэба асцярожна. Трэба так зрэзаць дрэва, каб яно ўпала на зямлю, не прынёсшы нікому шкоды. Таму даводзіцца на вышыні зразаць галіны і ствол па частках, узгадняючы работы і з сувязістамі, і з электрыкамі.

— Мы працуем у гэтай вёсцы ўжо два тыдні, — гаворыць Юрый Бохан, — за гэты час спілавалі каля пяцідзесяці аварыйных дрэў. Вёска ж вялікая, і дрэў, якія могуць выклікаць небяспеку, многа. Па ўсім бачна, што гэтым пытаннем тут раней ніколі не займаліся.

— Гэта сапраўды так, — уключыўся ў гутарку Мікалай Кожанаў, — і не толькі ў Побалаве, але ва ўсім раёне падобнай сістэмнай работы не вялося — яна была пушчана на самацёк: паваліць вецер дрэва — убяруць яго і чакаюць наступнага шквалу ветру. Так працягвалася да 2004 года, калі ў вёсцы Турск віхурай паваліла каля дваццаці дрэў, некалькі з якіх пашкодзілі дахі дамоў, вывелі са строю электралінію... Вось тады ў райвыканкаме і райсавеце дэпутатаў вырашылі не чакаць ля мора пагоды, а дзейнічаць на апярэджанне.

Праблема была абмеркавана дэталёва, з удзелам старшынь сельскіх Саветаў, кіраўнікоў гаспадарак, адпаведных раённых службаў, пасля чаго ў абласное ўпраўленне па надзвычайных сітуацыях паступіла просьба дазволіць раённаму аддзелу МНС стварыць брыгаду па зносу аварыйных дрэў і разборцы завалаў, якая б працавала на платнай аснове. Такі дазвол быў атрыманы, пасля чаго і пачалася работа.

Вядома, што знос аднаго аварыйнага дрэва абыходзіцца ў суму ад 60 да 200 тысяч рублёў — у залежнасці ад аб'ёмаў работ. Такую суму на вёсцы не кожная сям'я можа заплаціць, а вось частку — калі ласка. Пэўную дапамогу ў названай справе аказваюць сельскія Саветы і гаспадаркі, якія арганізоўваюць людзей на работу, выдзяляюць патрэбную тэхніку. Не забылі тут і пра выкарыстанне драўніны, якая пускаецца ў справу, і пра тое, што на месцы знесеных таполяў, бяроз, клёнаў павінны з'явіцца новыя, маладыя дрэвы.

Мікалай Кожанаў паказаў мне пералік знесеных за апошні год дрэў у шэрагу вёсак раёна. Іх — 1659. Дык гэта ж сапраўдны лесапавал! Нічога падобнага, запярэчыў старшыня райсавета. Перш чым ліквідаваць тое ці іншае дрэва, на месца выязджаюць прадстаўнікі службы аховы прыроды і навакольнага асяроддзя, жыллёва-камунальнай гаспадаркі і сельскіх Саветаў і робяць адпаведнае заключэнне.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

БУДУЕМ УСЁ, ШТО МАГЧЫМА...

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

ПАД канец года работнікі смалявіцкага «Райаграсэрвісу» атрымалі падарунак, аб якім марылі доўгі час. Два новыя дамы ў вёсцы Крывая Бяроза прынялі сваіх жыхароў — працаўнікоў гэтага прадпрыемства. Навагоднія святы прыемна было адзначыць і вёсцы Будагова — там рэканструявалі кацельню, якую ўзвялі яшчэ тры дзесяцігоддзі таму. Як жартуюць вяскоўцы, зараз самыя сцюдзёныя маразы ім не перашкода — чым ніжэй тэмпература навакольля, тым цяплей у хаце.

Навасёлы з вёскі Крывая Бяроза.

Смалявіцкі «Райаграсэрвіс» за час свайго існавання памятае розныя часіны. Былі і ўздымы, здаралася, што і крочылі ў адваротны бок. Сёння прадпрыемства можа ганарыцца тым, што развіваецца. Прынамсі, упершыню за дзесяць гадоў пачалі будаваць тут жыллё для работнікаў. Узвядзенне двух дамоў на дванаццаць кватэр кожны (першы быў здадзены крыху раней, другі — за два дні да новага года) дазваляе вырашыць праблему чаргі на жыллё. А гэта, як лічыць дырэктар «Райаграсэрвісу» Міхаіл Кананенка, галоўнае.

— У новых дамах жывуць даяркі, механізатары, вадзіцелі, маладыя спецыялісты. У асноўным моладзь, для якой кватэрнае пытанне — гэта праблема нумар адзін. Калі будзе жыллё, то будзе і работа, няма дзе жыць — няма ахвоты і працаваць. Таму мы ганарымся тым, што чаргі на нашым прадпрыемстве ўжо не існуе.

Увогуле, усе работнікі прадпрыемства маюць дах над галавой — калі не ў кватэры, то ў інтэрнаце прадпрыемства, у так званых маласямейках. Сістэма наступная — калі прыязджае на работу спецыяліст, яму даюць інтэрнат, потым будуюць дом, куды спецыяліста перасяляюць, а на свабоднае месца ў маласямейцы зноў засяляюць новага работніка. Але інтэрнат інтэрнатам, а ўсё роўна людзі мараць жыць у кватэры з усімі выгодамі. Дзякуючы сродкам аблвыканкама, раёна і ўласным укладанням, гэта стала магчыма. «Райаграсэрвіс» на хвалі ўздыму, сёлета ў вёсцы Куркава створаць аграгарадок, дзе і будуць жыць новыя працаўнікі аграсэрвісу. Новыя, таму што недахоп кадраў — асноўная праблема, якую плануюць вырашыць за кошт узвядзення жылля. З пашырэннем дзейнасці (а калі дакладней, запланавана будаўніцтва малочнай фермы з сучаснымі даільнымі заламі і памяшканнямі, рамонт школы, магазіна ў Куркаве) работы хопіць на ўсіх. Напрыклад, пасля прэзідэнцкага Указа № 138 прадпрыемства далучыла да сябе некалькі гаспадарак. Пасля чаго надоі малака з адной каровы павялічыліся з дзвюх тысяч кілаграмаў да шасці тысяч. Але гэта не мяжа, у планах Міхаіла Кананенкі — дзесяць тысяч літраў у год.

— Думаем запрасіць да нас на працу жыхароў з Магілёўскай, Гомельскай вобласці. Для таго, каб забяспечыць жыллём усіх жадаючых, у Куркаве ў 2007 годзе будуць пабудаваны шаснаццаць домікаў, пасля чаго запланавана ўзвядзенне яшчэ двух дванаццацікватэрных дамоў. Потым — газіфікацыя вёскі, асфальтаванне вуліцы. Вопыт будаўніцтва ёсць — у Крывой Бярозе, напрыклад, ужо працуе наш комплекс, які складаецца з кафэ, гасцініцы і крамы. Узровень абслугоўвання высокі — да нас прыязджаюць адпачыць нават са сталіцы. Грошы зарабляць навучыліся, таму і ёсць магчымасць клапаціцца аб людзях, ад якіх і залежыць вынік усёй нашай дзейнасці.

Бум будаўніцтва назіраецца ва ўсім Смалявіцкім раёне. Намеснік старшыні райвыканкама Васіль Цурыкаў расказаў, што ўпершыню летась было ўзведзена трыццаць восем з паловай тысяч квадратных метраў жылля. У апошні раз такое назіралася ў 1988 годзе, калі жыллё будавалі для перасяленцаў з чарнобыльскай зоны. Замест запланаваных 33 дамоў было пабудавана 88. На гэты год у праграму будаўніцтва закладзены ўжо 110 дамоў, трэба узвесці 40 тысяч «квадратаў».

— Мы ўвайшлі ў лідары па будаўніцтву жылля на Міншчыне. Разам з намі — Мінскі раён, Маладзечанскі, Салігорскі. Але там жыхароў у некалькі разоў больш, чым у Смалявічах. За тры гады аб'ём інвестыцый у будаўніцтва павялічылі ў дзесяць разоў — з 11 да 110 мільярдаў, — зазначае Васіль Цурыкаў. — Увогуле, акрамя жылля, будуем усё, у чым мае патрэбу раён. Гэта і новы стадыён, і школа-сад, і аб'екты жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Я скажу, што праграма будаўніцтва, без перабольшання, грандыёзная. Адзін з прыкладаў — кацельня ў вёсцы Будагова.

Гісторыя гэтага аб'екта ўвогуле драматычная. Яшчэ з часоў Савецкага Саюза, на працягу дваццаці пяці гадоў вёска Будагова атрымлівала цяпло з цеплатрасы суседняга Жодзіна. За час існавання стан яе прыйшоў у непрыгоднасць, і ў апошнія гады страты энергіі, якая накіроўвалася праз трубы на абагрэў усёй вёскі, дасягнулі 60 працэнтаў. Мільёны рублёў ішлі натуральна ў паветра, да таго і ў хатах было складана захаваць патрэбны рэжым абагрэву. Пачалі з газіфікацыі.

— У вёсцы жывуць перасяленцы з забруджанай радыяцыяй зоны. Для іх газ быў падведзены бясплатна. У мінулым ужо годзе газіфікавалі ўсю вёску, праведзены газ да кожнай хаты. Адначасова пачалі рэканструкцыю кацельні. Кошт усіх работ (разам з набыццём трох катлоў, два з якіх працуюць на газавым паліве, адзін — на мясцовым) склаў каля 700 мільёнаў рублёў, — гаворыць Васіль Цурыкаў.

Італьянскае абсталяванне працуе выдатна. Жыхары вёскі кажуць, што традыцыйнай печкай яны ўжо не карыстаюцца. Згодна з нарматывам, у пакоі ў халоднае надвор'е павінна быць не менш за 18 градусаў цяпла. Зараз ва ўсёй вёсцы гэтае патрабаванне выканана, да таго, кожны гаспадар мае магчымасць рэгуляваць тэмпературу абагрэву свайго дома самастойна.

Дзмітрый АЛЬФЕР.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ,
Смалявіцкі раён.

ЗАРОБАК СЦІПЛЫ, АЛЕ СТАБІЛЬНЫ,

або КУДЫ ПАЙСЦІ ДАЯРЦЫ Ў СВЯТОЧНАЙ СУКЕНЦЫ?

Даярка — распаўсюджаная прафесія ў сельскай мясцовасці. Праўда, пакуль у пераліку прэстыжных не значыцца. Каб прыдбаць гэту прафесію, у спецыяльных навучальных установах вучыцца не трэба. Дастаткова з дзяцінства бачыць, як даглядаюць карову, і даіць яе час ад часу на сваім падвор'і. Няблага яшчэ мець добрыя фізічныя паказчыкі, быць вынослівай і цярплівай.

Усімі гэтымі якасцямі валодае даярка фермы вёскі Крашына, што ў Аршанскім раёне, Ірына Шчарбакова. Летась яна надаіла ад кожнай каровы па 5740 літраў малака. А кароў у яе групе — 38. Гэта лепшы вынік па ферме, дзе працуюць пяць пастаянных даярак. Ды іншыя не намнога адсталі ад Ірыны: на 100—150 літраў. У сярэднім жа па ферме атрымалася па 5650 літраў малака ад каровы.

Ірыне пашанцавала. Яна прыйшла на ферму ў той час, калі саўгас «Аршанскі», на тэрыторыі якога яна жыла, перадалі буйному сельскагаспадарчаму прадпрыемству (свінагадоўчаму комплексу) «Задняпроўскі». На саўгасных фермах даяркі надойвалі крыху больш за дзве тысячы літраў малака ад каровы, а ў складзе «Задняпроўскага» хутка выйшлі ў лідары раёна па надоях і замахнуліся на шэсць тысяч літраў. Гэты факт гаворыць аб тым, што «вялікае малако» ў значнай ступені залежыць ад кіраўніцтва прадпрыемства. Але ж, як бы там ні было, а даярка таксама непасрэдна ўплывае на вытворчасць малака, яна ў гэтым працэсе «вінцік і шпунцік».

Ірына, дарэчы, пасля школы вывучылася на стаматолага ў медыцынскім вучылішчы. Прыехала працаваць у амбулаторыю роднай вёскі Пугляі. Заробак ёй плацілі з саўгаснай касы. А як расфарміравалі саўгас, адзінку стаматолага скарацілі. І засталася маладая жанчына без работы. У горад ездзіць далёка, ды і сваіх спецыялістаў там дастаткова. І ў вёсцы з працаўладкаваннем стала складана. Якраз тады і прапанавалі Ірыне пайсці даяркай у Крашына, што ў пяці кіламетрах ад Пугляеў.

Ёй няцяжка было пераарыентавацца на гэту работу. З ранняга дзяцінства Ірына дапамагала маці на саўгаснай ферме, разам з ёй карміла і даіла кароў. Так што пайшла рабіць тое, што добра ведала. І хутка стала даіць нават больш, чым даяркі са стажам.

За высокія надоі ўсе работніцы фермы летась і сёлета былі прэміраваны паездкай на фестываль «Славянскі базар» у Віцебск. Там Ірыне ўручылі і грашовую прэмію. Сума прэміі — звыш мільёна рублёў — вельмі ўзрадавала дваіх яе сыноў, Ілью і Кірыла. З той прэміі мама купіла ім даўно абяцаны камп'ютар.

Ірына ўпэўнена, што ў наш час прафесія даяркі даволі высока каціруецца ў сельскай мясцовасці. У параўнанні з працай механізатара даярка выйграе у стабільнасці заробку і рытмічнасці нагрузкі. Даярка зарабляе амаль аднолькава зімой і летам, у яе вызначаны графік работы на ўвесь год, нагрузка пастаянная, што дае магчымасць пазбягаць псіхалагічных стрэсаў.

Па сучасных мерках заробак у даярак сціплы: 350—400 тысяч рублёў. Але па вясковаму вымярэнню на такі заробак пражыць можна. Калі ж улічваць вялікія надоі і высокую якасць малака, то аплата працы быццам бы недастатковая. Даяркі гаварылі пра гэта свайму кіраўніку Віктару Зязюліну: маўляў, ці не пара прыбавіць? Той адмаўляе і спасылаецца на разлікі эканаміста. Разлікі сведчаць, што нават пры такіх высокіх надоях малако фермы Крашына стратнае. Затраты на кармы, лекі, прэпараты «з'ядаюць» увесь прыбытак. Гэта ў першую чаргу ад таго, што закупачныя цэны на малако нізкія. Таму і заробак у даярак невялікі і няма за кошт чаго яго падняць.

Працу даярак значна аблегчылі за апошнія гады. Акрамя даярак, ля кароў працуюць рабочыя, якія прывозяць кармы, прыбіраюць ля жывёлы, а даяркі толькі дояць ды посуд мыюць. Да таго ж дойка на ферме адбываецца два разы: раніцай і ўвечары (а ў большасці комплексаў і фермаў раёна дояць тры разы). Так што даяркі Крашына, лічы, ў прывілеяваным становішчы.

Але працаёмкіх працэсаў у гэтай прафесіі дастаткова і цяпер: кармушкі пачысціць, цялятак пры нараджэнні дагледзець. А самая цяжкая — перанесці малако ў халадзільную камеру. Кожная з жанчын за час адной дойкі пераносіць у руках каля 400 літраў малака (мінімум па 50 вёдзер), ад чаго баляць потым ногі і рукі.

> Кожная з жанчын за час адной дойкі пераносіць у руках каля 400 літраў малака (мінімум па 50 вёдзер), ад чаго баляць потым ногі і рукі

Каб не насілі даяркі вёдрамі малако патрэбны малакапровод. Раней на працягу 20 гадоў гэткае абсталяванне было на ферме. Але адслужыла свой тэрмін і гады чатыры таму разабралі яго з-за непрыгоднасці. Новае абсталяванне не закупілі. Нават для такога буйнога прадпрыемства, як «Задняпроўскі», набыць малакапровод пакуль не пад сілу.

Ірына Шчарбакова трымае дзвюх кароў і на ўласным падворку. Малако здае дзяржаве. Так папаўняе сямейны бюджэт. І муж стараецца зарабіць. Летам ён на камбайне, зімой — на машыне. Такім чынам апранаюць сыноў, адкладваюць грошы на новую мэблю.

Сабе абновы Ірына купляе рэдка — яна ўвесь час у рабоце, на ферме і дома, няма часу прыбірацца. Да таго ж, няма куды паказацца ў Пугляях у новых уборах. Клуб у чарговы раз закрылі — загадчыца клуба адмовілася працаваць з тым матэрыяльным забеспячэннем клуба, якое ёсць. У клубе няма нават музычнага цэнтра, каб вечарынку для моладзі забяспечыць. А аплата працы загадчыка клуба крыху перавышае 100 тысяч рублёў.

Пры закрытым клубе пацьмянела і вясковае жыццё. Пасля цяжкай працы даяркам і механізатарам хоць бы на святы патрэбны песня і музыка. Калі ж клуб закрыты, то ў якасці свята застаецца толькі застолле з суседзямі...

Неабходны клуб і для падлеткаў, моладзі. Ім трэба дзесьці сабрацца, патанцаваць, паслухаць музыку. Добра, калі гэта адбываецца пад кіраўніцтвам клубнага работніка ў абсталяваным памяшканні, а не ў закінутай хаце ці каля плота.

Праўда, застаўся яшчэ адзін культурны цэнтр у Пугляях — базавая школа. Яна месціцца ў былым панскім маёнтку, які пабудаваны больш за сто гадоў таму. Будынак добра захаваўся да нашага часу і цудоўна глядзіцца на фоне кветнікаў і саду. Пугляеўцы любяць сваю школу, памятаюць настаўнікаў, якія іх вучылі. Да таго ж, сядзіба напамінае ім, што на гэтай зямлі стагоддзямі расцілі хлеб і даглядалі жывёлу.

Вольга ШУТАВА.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

І НЕ ГОРАД, І НЕ ВЁСКА,

або ў Пінкавічах, на пятай Садовай

ПІНСК на ўсходзе плаўна перацякае ў вёску Вешавічы Пінкавіцкага сельсавета. Няма нават дакладна акрэсленай граніцы. Насамрэч яна праведзена на картах і дакументах. Але чалавеку недасведчанаму не вельмі проста бывае вызначыць: у горадзе ён у дадзены момант ці ў вёсцы,калі адзін бок вуліцы Даватара адносіцца да Пінска, а другі — да Вешавіч. А Вешавічы ў сваю чаргу зліваюцца з Пінкавічамі. Такое геаграфічнае становішча накладвае адбітак і на характар жыхароў, іх калектыўны менталітэт.

«Жывыя» грошы

Так лічыць старшыня Пінкавіцкага сельскага Савета Любоў Дарашэнка. У дзвюх названых вёсках жыве 5100 чалавек. На без малога дзве тысячы дамаўладанняў у сельсавеце значыцца ўсяго 70 кароў. Можна падумаць, што людзі аддаюць перавагу гарадскому тыпу жыцця. Але гэта не зусім дакладна. Бо Пінкавічы славяцца сваімі памідорамі, ранняй капустай і іншай агароднінай.

Нягледзячы на тое, што забудова ў вёсках вельмі шчыльная і на некаторыя дамы выпадае літаральна некалькі сотак прысядзібнага ўчастка, тут кожны лапік зямлі старанна дагледжаны і апрацаваны. І людзі жывуць заможна. Ёсць такія прыклады, калі ў доме кожны з пяці дарослых членаў сям'і мае свой аўтамабіль. Гэтакія пінскія Альшаны ў паменшаным выглядзе.

Сапраўды, кароў і іншую жыўнасць тут трымаюць не ахвотна, а вось цяпліцы стаяць паўсюль. Тутэйшыя жыхары прывыклі здабываць капейку ад працы на зямлі. Руплівыя гаспадары, а такіх тут большасць, здымаюць са сваіх агародаў па тры ўраджаі. З пачатку студзеня плошчу засяваюць расадай, напрыклад, ранняй капусты. Да пачатку сакавіка саджанцы гатовы, іх збываюць на рынку, але не ўсе — частку пакідаюць сабе. Капуста рассаджваецца па ўсёй цяпліцы, і ў канцы мая становіцца таварным прадуктам, які зноў жа прыносіць «жывыя» грошы. Ну а пасля збору ўраджаю ў грунт высаджваюцца памідоры, якія забяспечваюць прыбытак гаспадару ў трэці раз.

Некаторыя прымяняюць іншы парадак севазвароту — гэта залежыць ад узроўню агранамічных ведаў і асабістага вопыту земляроба. На тутэйшай зямлі добра растуць і агуркі, і кабачкі з баклажанамі, укроп, пятрушка, радыска, — усё, чым багаты пінскія рынкі практычна цэлы год. Але на базарах роднага райцэнтра гаспадары збываюць адзінкі працэнтаў сваёй прадукцыі. У асноўным вязуць свежую гародніну ў Мінск, Маладзечна, Барысаў, некаторыя раёны Віцебскай вобласці. У кожнага вытворцы адпрацаваны свае каналы збыту і свае маршруты гандлю.

Шматдзетныя — і не бедныя

Цікавая гісторыя гэтага, так бы мовіць, местачковага бізнэсу. Пачыналі яго «цаліннікі» са Столінскага раёна і суседніх раёнаў Украіны. Людзі прыязджалі на Піншчыну, тут ім давалі пляц пад забудову. І перш-наперш яны будавалі дом. Потым апрацоўвалі кожную пядзю зямлі, узводзілі цяпліцу і пачыналі вырошчваць агародніну. Было гэта ў 70-я гады... Ужо тады ў некаторых населеных пунктах Століншчыны, вялікіх украінскіх сёлах адчуваўся дэфіцыт зямлі. А ў Пінскім раёне яе не шкадавалі для руплівых гаспадароў. Словам, не паспелі азірнуцца, як у Пінкавічах выраслі пяць Садовых вуліц. Ці то фантазіі не хапіла, каб прыдумаць іншыя назвы, ці нехта знарок захацеў правесці паралель з вялікімі савецкімі гарадамі, дзе прынята было ўсё называць аднолькава? Але ж да гэтай пары большасць пінкавіцкіх працаўнікоў жывуць на Садовых вуліцах.

Такія, як Сямён Саланевіч, напрыклад. Працавалі з жонкай з самай маладосці. Цяпер дзеці выраслі, усе вызначыліся ў гэтым жыцці, усе навучыліся здабываць хлеб сваёй працай. Можна назваць і Віктара Беляковіча. Іх з гаспадыняй дом — поўная чаша. Пяцёра дзяцей выгадавалі, усе як адзін пабудавалі свае хаты тут жа, нікуды не паехалі, усе годна жывуць і працуюць. Шматдзетныя сем'і ў Пінкавічах і Вешавічах — не рэдкасць. Іх тут усе ведаюць, паважаюць, бо яны нічога ні ў кога не просяць. Бацькі пецярых дзяцей Каваліцкія нядаўна нават узялі кавалак зямлі ў арэнду — свайго ўчастка для іх гаспадаркі аказалася мала, і апрацоўваюць яе, маюць даход. Гэта маладая сям'я, малодшаму іх сыну ўсяго паўтара года.

Старшыня сельскага Савета Любоў Дарашэнка ганарыцца сваімі шматдзетнымі сем'ямі. Любоў Аляксандраўна кажа: «Калі чую ад сваіх калег, якія праблемы яны часам маюць з сем'ямі, дзе расце многа дзяцей, яшчэ больш пачынаю шанаваць сваіх». Паводле слоў кіраўніка мясцовай улады, у іх вёсках бацькі асабістым прыкладам выхоўваюць у дзяцей асаблівае стаўленне да жыцця. Яно заключаецца ў тым, што дабрабыт можна здабыць у нялёгкай працы. І сваю першую капейку хлопчыкі і дзяўчынкі вучацца зарабляць у раннім школьным узросце. У аднаўленасці з цяперашнімі законамі дзяржава дапамагае шматдзетным сем'ям, напрыклад, палепшыць жыллёвыя ўмовы. Такой дапамогай ужо скарысталіся пяць сем'яў з Пінкавіцкага сельсавета. Але гэта не значыць, што яны жылі дрэнна, проста з'явілася магчымасць абмяняць кватэру на большую або добраўпарадкаваць раней пабудаваны дом.

Барацьба за «пядзю»

У гэтым сельсавеце не ўзнікае пытанняў са старымі дамамі. На іх своечасова афармляецца спадчына, іх падтрымліваюць у належным стане. Затое набягае шмат іншых пытанняў — усё, што датычыць межаў. Спрэчкі ўзнікаюць паміж суседзямі ну ледзь не за пяць сантыметраў зямлі. І першай прыцягваюць на «перадавую» гэтай барацьбы, вядома ж, мясцовую ўладу. Па-рознаму даводзілася тушыць канфлікты старшыні Дарашэнка. Было нават з дапамогай... бензапілы. Калі адзін сусед без канца скардзіўся на другога за тое, што на мяжы паміж участкамі раслі суседскія слівы. Цікава, што наконт сваіх вішань, якія таксама раслі на той жа мяжы, ён казаў так: «А яны мне не перашкаджаюць». І вось калі па распараджэнню старшыні Савета спілавалі ўсе дрэвы, што раслі на мяжы, гэта аказала проста цудоўнае дзеянне на іншых скаржнікаў па аналагічных пытаннях. Яны хуценька пазабіралі свае пісьмовыя прэтэнзіі.

А адна памежная зямельная спрэчка так урэзалася ўсім у памяць, што нават раённая пракуратура праводзіла на той злашчаснай мяжы семінар-вучобу для сваіх работнікаў.

Галаўным болем і для мясцовага насельніцтва, і для ўлады стаў асаблівы кантынгент людзей, якія паразітуюць на чэснай працы гаспадароў. Пэўная група п'яніц, бамжоў даўно аблюбавала цяпліцы як сродак для дармавой спажывы. Украдзе такі чалавек кілаграм памідораў ці агуркоў, прадасць каля бліжэйшага магазіна — выпіўкай на дзень забяспечаны. З такімі стратамі пінкавіцкія земляробы ўжо амаль што змірыліся. Калі і зловяць зладжюжку супрацоўнікі міліцыі, то да якой адказнасці прыцягнеш яго за пару памідораў?

Часцей за ўсё на злачынны промысел выходзяць гарадскія асобы. Тутэйшыя ж вяскоўцы хлеб і да хлеба здабываюць руплівай працай. А для нармальнага жыцця ў Пінкавічах усё ёсць.

Яшчэ адна прыкмета, якая сведчыць аб, так бы мовіць, сціранні граняў паміж горадам і вёскай — прамысловы бізнэс, які пацягнуўся з райцэнтра. Сёння ў Пінкавічах і Вешавічах паспяхова працуюць цэлы шэраг прыватных прадпрыемстваў па вытворчасці мэблі, медыцынскай тэхнікі, а таксама рамонту і вырабу агрэгатаў для сельскай гаспадаркі і меліярацыі. Кіраўнікоў прадпрыемстваў людзі па традыцыі выбіраюць дэпутатам у сельскі Савет. У такой якасці яны, як правіла, болей згаворлівыя, калі справа датычыць вырашэння нейкіх агульных праблем населенага пункта.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Пінскі раён.

«КРЫНІЦА» ПА-ПОЛАЦКУ

Згодна з рашэннем Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, у бліжэйшыя 5 гадоў «Пріорбанк» будзе па даверу ўпраўляць пакетам акцый ААТ «Крыніца», якія належаць на праве ўласнасці Віцебскай вобласці. Гэтыя акцыі коштам па 3600 рублёў трапілі ва ўласнасць Віцебскай вобласці ў выніку рэарганізацыі ААТ «Полацкае піва» шляхам яго далучэння да ААТ «Крыніца».

Вытворчасць піва ў Полацку будзе наладжана на самым высокім узроўні: да 2011 года плануецца поўнасцю рэканструяваць і мадэрнізаваць вытворчае абсталяванне. Справа ў тым, што на базе маёмасці ААТ «Полацкае піва» нядаўна з дапамогай «Пріорбанка», што зарэкамендаваў сабе ў якасці сур'ёзнага інвестара знакамітай мінскай «Крыніцы», быў створаны філіял ААТ «Крыніца» — «Полацкае піва». Аматары піва ўжо заўважылі добрыя змены ў якасці піва, што прадаецца пад папулярнымі «крынічнымі» гандлёвымі брэндамі. А нядаўна прадстаўнікі «Пріорбанка» звярнуліся да мясцовых уладаў з просьбай аб перадачы на 5 гадоў у кіраванне па даверу 353 309 акцый «Крыніцы», што належаць на праве ўласнасці Віцебскай вобласці (8,34 працэнта ўстаўнога фонду) на агульную суму больш за 1 мільярд 271 мільён беларускіх рублёў. І такая прапанова была задаволена.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Для зручнасці

Якія толькі непрадбачаныя абставіны не ўзнікаюць у чалавека — напрыклад, адключылася святло, прарвала водапровад, сарвала з даху дома тэлевізійную антэну...

У Гомелі на дапамогу ў падобных выпадках можа прыйсці 31 арганізацыя, якая мае сваю дзяжурна-дыспетчарскую службу. Натуральна, што ўсіх тэлефонных нумароў мы не ведаем, таму і павінны траціць час на пошукі...

У 2007 годзе сітуацыя зменіцца да лепшага — гарадскі выканаўчы камітэт прыняў рашэнне аб стварэнні адзінай дзяжурна-дыспетчарскай службы, у якую ўвойдуць усе ведамасныя службы падобнага тыпу. Кіраўніцтва АДДС будзе ажыццяўляць цэнтр аператыўнага кіравання пры гарадскім аддзеле па надзвычайных сітуацыях.

Такім чынам, калі адбудуцца нейкія парушэнні ва ўмовах жыццядзейнасці чалавека, ён можа набраць па тэлефону толькі адзін нумар — «01».

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ТЕОРИЯ И ПРАКТИКА

ПРАВО КАЖДОГО

Человеку необходимо иметь возможность влиять на собственную жизнь

НЕВОЗМОЖНО представить, что центральное правительство на удовлетворительном уровне будет решать ежедневные текущие проблемы около 1,6 тысячи административно-территориальных единиц, либо витебская областная администрация обеспечит благоустройство 38 городских и 3895 сельских поселений. Люди должны усвоить, что комфортные условия для жизни в их селе или городе могут создать только они сами. Действующие законы предоставляют для этого определенные возможности, но и они используются не в полной мере. Причина этого видится в том, что жители не всегда отождествляют себя с местной властью, не убеждены в реальном влиянии на ее функционирование и не имеют достаточного представления о своих возможностях для этого.

Право каждого гражданина на участие в управлении государственными делами закреплено в Международном пакте о гражданских и политических правах (ст. 25). Объективно существуют три уровня управления государством: центральный, региональный и местный с различным кругом полномочий. Наибольшую ценность для человека представляет качественная работа системы местной власти, как наиболее близкой к гражданам и осуществляющей коммунальное жизнеобеспечение. Современное местное самоуправление предстает в виде своеобразного обслуживающего концерна, где первостепенное значение приобретают сервисные функции (строительство и содержание дорог и мостов, объектов водоснабжения и канализации, инженерной инфраструктуры, транспорта и т.п.). Местная власть по своей сути не законодательная и не исполнительная, а сервисно-обслуживающая. Целесообразно местные вопросы, непосредственно затрагивающие территориальное образование и его население, решать на местном уровне, что представляется более эффективным по сравнению с их передачей в ведение иных органов. Не стоит всерьез рассчитывать, что правительство или министерство может оказывать реальное влияние на повседневную работу коммунальной котельни, водопровода, автобусного парка либо уследить за тем, как где-нибудь в Каменце или Хотимске расходуются бюджетные деньги. Поэтому необходим продуманный закон, закрепляющий понятные начала организации системы местной власти, и — что принципиально важно, — построенной на принципах самоуправления. В производство и предоставление коммунальных услуг требуется включение, без преувеличения, всех жителей. Здесь могут реализовать себя и трудоспособные пенсионеры. Положения закона подлежат развитию в уставах конкретных территориальных образований. Наличие уставов важно потому, что по территориальному жизнеобеспечению абсолютный приоритет имеют имущественно-хозяйственные и финансово-бюджетные отношения, которые требуют для надежной защиты интересов участников максимальной правовой регламентации.

Согласно ст. 37 Конституции Республики Беларусь, граждане имеют право участвовать в решении государственных дел как непосредственно, так и через свободно избранных представителей. Этот принцип распространяется и на местное самоуправление. Высшими формами непосредственного осуществления территориальным сообществом местного самоуправления является местный референдум и выборы депутатов местных Советов.

Современная система государственного управления является преимущественно представительной. В связи с этим граждане должны иметь возможность выражать свои нужды, пожелания и приоритеты, участвуя в выборах в качестве избирателей. На следующих выборах депутатам и другим избираемым должностным лицам необходимо держать ответ о работе, проделанной в период между выборами. Также одним из основополагающих принципов местного управления является контроль, осуществляемый выборными представителями за обеспечением запросов и интересов населения всеми другими властными и производственными структурами.

Путем местных выборов избираются депутаты местных Советов, могут замещаться иные должности местного самоуправления, если это предусмотрено законодательством. Современные прямые выборы должностных лиц представляются таковыми только на первый взгляд. В реальности представляемые на суд граждан кандидатуры предварительно проходят многоэтапные имиджевые отборы в структурах гражданского общества, и прежде всего в политических партиях. Без этого страховочного механизма прямые выборы должностных лиц местного самоуправления преждевременны.

Первоочередное значение для реализации принципов народовластия имеет преобразование местных Советов депутатов в реально работающие органы, способные нести ответственность перед гражданами за жизнедеятельность территориального образования. Решения в Советах во всем мире принимаются большинством голосов депутатов. Поэтому для того, чтобы Совет был дееспособной структурой, он должен состоять из предельно ограниченного числа объединений депутатов, и чем меньше их будет, тем лучше. Иначе сформировать повестку дня, обсудить вопрос на сессии и добиться большинства голосов практически невозможно, а предвыборные обещания кандидатов имеют незначительные шансы на практическое воплощение. Для воздействия на представительный орган граждане также должны быть консолидированы на базе заинтересованного участия в решении публичных задач. Формой управленческой работы могут быть обсуждения местных проблем в коммунальных клубах, сформированных как по территориальному, так и по отраслевому принципу, предшествующие принятию важных решений Советами и исполнительными органами. Это поможет преодолеть такие проблемы, как пассивность и социальная самоизоляция. При создании предпосылок участия граждан в местном управлении, для них должны предоставляться места для встреч и ведения диалога, чтобы они могли получать информацию, повышать образовательный уровень и обсуждать местные проблемы (это могут быть библиотеки, школы, спортивные сооружения). Много говорится о коммунальной инфраструктуре для молодежи, а о взрослых почему-то забывают. Мероприятия не должны быть казенно-заорганизованными, информацию следует излагать в простой и понятной форме. Человеку необходимо ощущать возможность влиять на собственную жизнь и состояние своего населенного пункта. Значение имеет активность граждан и в период между выборами, осознание того, что их мнение может повлиять на принимаемые решения. Благодаря этому население преобразуется в сообщество, в рамках которого личность становится субъектом власти и в случае необходимости использует эту власть. В ином случае человек будет оставаться пассивным потребителем коммунальных услуг.

> Не стоит рассчитывать, что правительство или министерство могут оказывать реальное влияние на повседневную работу коммунальной котельни, водопровода, автобусного парка где-нибудь в Каменце или Хотимске.

В мире получили широкое распространение местные референдумы, на которых непосредственно жителями принимаются решения по вопросам, которые отнесены Конституцией и законами к ведению местного самоуправления. Это может быть объединение коммун, размещение на соответствующей территории предприятий и т.п. Например, жители Стокгольма в сентябре текущего года высказали свое мнение на референдуме по поводу взимания платы за въезд в город на автомобиле. Иные вопросы, имеющие важное значение для территориального сообщества, его экономического, социально-культурного развития могут быть вынесены на местный консультативный референдум, последствия которого не имеют обязательного характера.

Общие собрания граждан, в том числе собрания уполномоченных по месту проживания, созываются по домам, улицам, кварталам, микрорайонам города, сельским населенным пунктам в целях обсуждения и решения вопросов территориального значения. Собрание правомочно, если в нем принимает участие не менее 25 процентов жителей, достигших восемнадцати лет, или не менее двух третей уполномоченных.

Решения общих собраний граждан являются обязательными для исполнения органами территориального общественного самоуправления и имеют рекомендательный характер для уполномоченного государственного органа или органа местного самоуправления.

Жители имеют право направлять коллективные или индивидуальные обращения в органы и к должностным лицам местного самоуправления по вопросам их компетенции. Следует предусмотреть, что информация о коллективных обращениях, подписанных более чем пятьюстами жителями, передается на рассмотрение соответствующего Совета депутатов. Коллективные обращения могут содержать конкретные предложения по вопросам территориального развития; анализ работы местных органов власти, коммунальных и иных организаций; выражать недоверие должностному лицу и т.п.

Жители в целях осуществления контроля работы депутатов и органов местного самоуправления вправе принимать участие в общественных слушаниях, представляющих собой встречи с депутатами местного Совета и должностными лицами местного самоуправления, во время которых анализируется информация о состоянии местных дел, вносятся предложения по вопросам местного значения. Подготовку общественных слушаний, предварительное информирование жителей об обсуждаемых вопросах обеспечивает исполнительный комитет.

Жители имеют право инициировать рассмотрение местным Советом в порядке местной инициативы любого вопроса, отнесенного к ведению местного самоуправления. Местная инициатива предусматривает внесение в Совет проекта нормативного правового акта. Очевидно, что такая инициатива подлежит поддержке тем количеством избирателей, которое необходимо для инициирования местного референдума. Инициированные жителями проекты подлежат широкому обсуждению и первоочередному рассмотрению на сессии.

Жителям предоставляется право присутствовать на открытых заседаниях местного Совета и органов территориального общественного самоуправления. В регламентах Советов необходимо предусмотреть обязанность секретаря сессии обеспечить такое посещение и трансляцию заседания по местному радио. Жители должны иметь возможность без каких-либо ограничений присутствовать на мероприятиях в связи с разработкой местного бюджета, программ социально-экономического развития, местных целевых программ, проектов решений по вопросам, представляющим существенный общественный интерес. В последние годы в мире получает распространение практика «гражданского местного бюджета», когда решающая роль в формировании его показателей отводится жителям (Показательно, что при таких подходах на местных референдумах граждане отклоняли предложения о снижении налогов).

Органы и должностные лица местного самоуправления должны способствовать становлению новых форм участия жителей в осуществлении местного самоуправления. Это могут быть общественные обсуждения проектов актов местного совета, иных органов местного самоуправления (прежде всего проекты программ и планов социально-экономического развития, целевых программ, местного бюджета); участие в общественных комиссиях или экспертных советах в качестве специалистов при решении вопросов (советы пенсионеров, инвалидов, военнослужащих и т.п.); участие в органах самоорганизации населения; выполнение на общественных началах работ по благоустройству населенных пунктов; оказание материальной и финансовой помощи местному самоуправлению. Совместная жизнь в территориальном сообществе требует добровольного участия в решении социальных задач, развития чувства личной ответственности за среду проживания и благополучие других.

Валерий СИДОРЧУК,
доцент Белорусского государственного университета,
кандидат юридических наук.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:
МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;
САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;
СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;
СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;
ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292-21-03.

ААТ «Мазырскі НПЗ» працуе са снежаньскім узроўнем загрузкі

ААТ «Мазырскі НПЗ» працуе з такім жа ўзроўнем загрузкі, як і ў снежні 2006 года. У мінулым месяцы яна складала больш як 25 тыс.т у суткі па сыравіне. Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА на прадпрыемстве.

Паводле слоў спецыялістаў, Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод па выніках 2006 года перапрацаваў больш як 10 млн т нафты. Цяпер прадпрыемства працуе стабільна, выкарыстоўваючы аб'ёмы нафты, што пераходзяць з мінулага года. Пакуль іх дастаткова. «На бліжэйшыя дні запасаў хапае, а далей чакаем, што сітуацыя вырашыцца», — падкрэслілі на заводзе.

Тут праінфармавалі таксама, што пастаўкі сыравіны для ААТ «Палімір» ажыццяўляюцца на сённяшні дзень Мазырскім НПЗ у ранейшых аб'ёмах.

БЕЛТА.

«Нафтан»: усё спакойна!

«Зараз наваполацкае ААТ «Нафтан» працуе стабільна. На прадпрыемстве робяць усё дзеля таго, каб былі выкананы адпаведныя планы», — менавіта так пракаментавалі афіцыйныя прадстаўнікі «Нафтана» сённяшнюю сітуацыю на прадпрыемстве.

Мінулы год, як адзначыў генеральны дырэктар Вячаслаў Якушаў, стаў трамплінам для пачатку рэалізацыі новай праграмы развіцця «Нафтана», разлічанай да 2010 года. У выніку аб'ём нафты, што змогуць тут перапрацоўваць, павялічыцца да 12 мільёнаў тон у год, і глыбіня перапрацоўкі будзе даведзена да 90—95 працэнтаў, што дазволіць пастаўляць заказчыкам нафтапрадукты, поўнасцю ідэнтычныя еўрапейскім патрабаванням.

Як расказаў намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце і кадрах Мікалай Калбасенка, на «Нафтане» ўсё спакойна: «Пакуль у Расіі працягваюцца святы, нафты на прадпрыемстве хопіць, і нават больш таго, а потым атрымаем новую нафту. Як працавалі з прыбыткам, так і будзем. Шкада, што такі падыход з боку Расіі можа ў цэлым дрэнна паўплываць на эканоміку ва ўсёй рэспубліцы».

Мае суразмоўцы падкрэслілі, што ў мінулым, 2006-м, на «Нафтане» аб'ём выраблянай прадукцыі павялічыўся больш як на 25 працэнтаў. Усяго перапрацавалі каля 10 мільёнаў тон нафты. Каля 70 працэнтаў прадукцыі «Нафтана» экспартуецца ў краіны Еўрасаюза... Адпаведна вялікія сумы ў выглядзе падаткаў былі пералічаны ў бюджэт. У лютым будзе адзначацца чарговая гадавіна існавання прадпрыемства, гісторыя якога пачынаецца 9 лютага 1963 года.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Віктар МАРАХІН:

«ЦАНА ПРОДАЖУ АКЦЫЙ «БЕЛТРАНСГАЗА» З'ЯЎЛЯЕЦЦА ПРЫМАЛЬНАЙ ДЛЯ БЕЛАРУСІ»

Нягледзячы на падпісанне кантракта аб пастаўках у Беларусь расійскага газу, сітуацыя ў беларуска-расійскіх адносінах застаецца напружанай. Так, Расія не дазваляе пастаўляць беларускі цукар у краіну, а 3 студзеня беларускі ўрад заявіў пра ўвядзенне мытных пошлін на расійскую нафту, якая пастаўляецца праз тэрыторыю Беларусі ў Еўропу.

Пра беларуска-расійскі эканамічны канфлікт карэспандэнт «Звязды» гутарыць з намеснікам старшыні Камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віктарам МАРАХІНЫМ.

— Як вы ацэньваеце дасягнутае ў апошнія хвіліны 2006 года (па маскоўскаму часу) пагадненне аб пастаўках расійскага газу ў Беларусь?

— Мы мелі міжурадавае пагадненне аб адзіных тарыфах на газ. І кошт газу павінен быў падняцца не больш чым на 15 працэнтаў. Аднак, паколькі «Газпрам» прад'явіў ультыматум, а таксама для таго, каб не парушаць пастаўку газу іншым спажыўцам, Беларусь была вымушана прыняць умовы «Газпрама». Прычым гэтыя ўмовы ішлі сумесна з умовамі пастаўкі сырой нафты для Беларусі. Вырашэнне гэтых пытанняў, напэўна, было ўзаемазвязана. І таму Беларусь пайшла на падпісанне дастаткова нявыгадных для сабе ўмоў.

— Як вы ацэньваеце тое, што 50 працэнтаў акцый «Белтрансгаза» будзе набыта «Газпрамам»?

— Думаю, цана продажу акцый «Белтрансгаза» з'яўляецца прымальнай для Беларусі. Пра цану ў 5 млрд долараў ЗША мы гаварылі адразу. Расія ж спачатку гаварыла пра 800 млн, потым пра 1 млрд 200 млн. Аднак незалежныя эксперты ацанілі «Белтрансгаз» у 5 млрд. Гэта значыць наша цана была пацверджана.

Станоўчае ў пагадненні паміж беларускім і расійскім бакамі тое, што яно падпісана не на год, а на чатыры гады. І да 2011 года мы павінны выйсці на сусветныя цэны на газ. І мы будзем планаваць пераход, вырашаць звязаныя з ім пытанні. Хоць зараз павышэнне кошту газу прымушае ўрад прымаць рашучыя меры, каб сацыяльныя артыкулы бюджэту не пацярпелі.

— Нягледзячы на дасягненне пагаднення аб пастаўках газу, сітуацыя ў беларуска-расійскіх эканамічных адносінах у першыя дні 2007 года складваецца вельмі праблематычная. 3 студзеня беларускі ўрад абвясціў аб уводзе пошлін на расійскую нафту, якая ідзе праз тэрыторыю краіны на Захад. Як вы ацэньваеце такі крок?

— Гэта мера ў адказ на ўвядзенне Расіяй мытных пошлін на нафту, экспартуемую ў Беларусь. Гэта адэкватныя дзеянні беларускага ўрада. Я лічу, што гэта цалкам нармальная мера і пасля выхадных у Расіі, пасля 8 студзеня, паміж бакамі пачнуцца сур'ёзныя перамовы. І па дадзенай праблеме будзе знойдзены кампраміс.

— Ці пагадзіцца, на ваш погляд, Расія на раздзел экспартных пошлін на пастаўляемую ў Беларусь нафту? Якім можа быць гэты падзел?

— Прагноз рабіць не буду. Але я ўпэўнены, што Расія і Беларусь прыйдуць да кампраміснага рашэння, якое будзе задавальняць абодва бакі.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

Валяр'ян КАРОЛЬ:

«РАЗВІЦЦЁ САЦЫЯЛЬНЫХ ПАСЛУГ ЗАЛЕЖЫЦЬ ТОЛЬКІ АД АДНАГО — ПАТРЭБЫ ЛЮДЗЕЙ»

Апынуцца ў няпростай сітуацыі можа кожны. Аднак пры гэтым кожны, хто па стану здароўя ці якіх-небудзь іншых аб'ектыўных прычынах ужо ці яшчэ не ў стане вырашыць уласныя праблемы самастойна, мае поўнае права разлічваць на падтрымку з боку дзяржавы. Не сакрэт, што адно з першых у новым годзе святаў — Дзень работніка сацыяльнай абароны — мае па-сапраўднаму асаблівы статус. І не толькі для людзей, для якіх дапамога пенсіянерам, інвалідам, дзецям, шматдзетным і няпоўным сем'ям, былым выхаванцам дамоў-інтэрнатаў і нават асобам, што вярнуліся з месцаў пазбаўлення волі, стала прафесійнай справай. «Сацыяльныя» пытанні цікавяць калі не ўсіх, то, прынамсі, большасць грамадзян нашай краіны. Таму напярэдадні гэтай даты карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з намеснікам міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валяр'янам Васільевічам КАРАЛЁМ.

— Адзін раён — адзін тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Нягледзячы на стварэнне цэнтраў, магчымасць карыстацца іх паслугамі рэальна маюць не ўсе грамадзяне, каму патрэбна сацыяльная падтрымка. Дзе тут выйсце?

— Само пытанне толькі пацвярджае старую прымаўку — да добрага прывыкаеш хутка. Нагадаю, што паўсюль тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва былі створаны ў лістападзе 2004 года, а гэта — вельмі невялікі адрэзак часу. Тым не менш значная частка нашых грамадзян ужо не ўяўляе сябе без паслуг цэнтраў, а ў кіраўніцтва гарадоў і раёнаў з'явілася трывалая практыка даручаць ім вырашэнне самых розных сацыяльных пытанняў і праблем — ад аказання матэрыяльнай дапамогі малазабяспечаным і да садзейнічання ў атрыманні жылля дзецям-сіротам.

Па выніках студзеня—верасня мінулага года трэба адзначыць, што сацыяльным абслугоўваннем было ахоплена 12 028 населеных пунктаў нашай краіны, і ў тым ліку — 3681 аддаленая малакольскасная вёска, а таксама ўсе аграгарадкі. Каб зрабіць сацыяльныя паслугі больш даступнымі, пры тэрытарыяльных цэнтрах адчыняюцца сацыяльныя пункты і філіялы (у пачатку кастрычніка іх налічвалася 110), аддзяленні круглясутачнага знаходжання (34), ствараюцца брыгады сацыяльнага абслугоўвання на мабільнай аснове (25), развіваюцца іншыя формы дапамогі. Пры гэтым для ахопу паслугамі ўсіх населеных пунктаў без выключэння, у снежні 2005 года па даручэнню міністэрства аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам зацвярджаны рэгіянальныя праграмы па аптымізацыі і пашырэнню сеткі ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання на 2006—2010 гады. Толькі за дзевяць месяцаў мінулага года ў рамках гэтых праграм у тэрытарыяльных цэнтрах было адчынена 95 новых аддзяленняў, і ў тым ліку 63 сацыяльныя пункты і філіялы. А агульная колькасць грамадзян, што знаходзяцца на ўліку, павялічылася на 164 тысячы чалавек.

Дарэчы, калі гаворка ідзе аб даступнасці, нельга не спыніцца яшчэ на адным моманце. Ужо стала практыкай штогадовае правядзенне абследаванняў адзінокіх пажылых грамадзян, выяўленне іх патрэбнасцяў і аказанне дапамогі. Так, па стану на 1 кастрычніка мінулага года сацыяльныя работнікі наведалі 148,1 тыс. адзінокіх састарэлых людзей, з якіх дзве трэці выказалі тыя ці іншыя просьбы і пажаданні. Прычым у выніку ўдалося задаволіць больш чым 93 працэнты гэтых заявак.

— Як вядома, сёння кожны тэрытарыяльны цэнтр мае свае асаблівасці — скажам, па відах паслуг. Ці плануецца прывесці сам пералік гэтых паслуг да нейкага адзінага стандарту?

— Як вядома, у нас устаноўлены пералік бясплатных і агульнадаступных паслуг, якія прадастаўляюцца дзяржаўнымі ўстановамі сацыяльнага абслугоўвання, ёсць нормы і нарматывы забеспячэння такімі паслугамі. Інакш кажучы, існуе пэўны гарантаваны «пакет», што зацверджаны заканадаўча і прадастаўляецца грамадзянам незалежна ад месца іх пражывання. Разам з тым заўважу: тэрытарыяльныя цэнтры не павінны і не могуць быць аднолькавымі. Сама іх структура вызначаецца ў рэгіёнах — у залежнасці ад мясцовых сацыяльна-дэмаграфічных асаблівасцяў і фінансавых магчымасцяў. Менавіта з улікам гэтых акалічнасцяў, да прыкладу, у Мінскай і Гомельскай абласцях актыўна ствараюцца аддзяленні дзённага знаходжання для дзяцей-інвалідаў, у сталіцы і ў Магілёўскай вобласці — аддзяленні псіхалагічнай дапамогі і рэабілітацыі, а на той жа Магілёўшчыне і на Віцебшчыне — аддзяленні круглясутачнага знаходжання для пажылых адзінокіх людзей.

— Дарэчы, на ваш погляд, на развіццё якіх сацыяльных паслуг будзе рабіцца стаўка ў бліжэйшы час?

— Развіццё тых ці іншых відаў сацыяльных паслуг залежыць толькі ад аднаго — рэальных патрэб саміх людзей. Таму плануецца і надалей пашыраць інфраструктуру тэрытарыяльных цэнтраў, ствараць пры іх аддзяленні дзённага знаходжання для дзяцей-інвалідаў, маладых інвалідаў з працоўнымі майстэрнямі і гурткамі па інтарэсах, аддзяленні дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў, адчыняць філіялы і сацыяльныя пункты. І паралельна — укараняць новыя віды паслуг. Бо не выпадае сумнявацца, што найбольшым попытам тут будуць карыстацца паслугі сядзелак, паслугі нянечкі па догляду дзяцей, транспартныя, гаспадарча-бытавыя і некаторыя іншыя паслугі, і ў тым ліку — на платнай аснове.

— Аднак у той жа час, ці застануцца такія паслугі даступнымі?

— Безумоўна. Паслугі, што аказваюць тэрытарыяльныя цэнтры, па аплаце былі і застануцца даступнымі для ўсіх катэгорый грамадзян нашай краіны. І, да слова, гэта гарантуецца Законам «Аб дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартах».

— Таксама няпростае пытанне. Вядома, што ў асобных рэгіёнах тарыфы на сацыяльныя паслугі могуць адрознівацца. Чым гэта тлумачыцца? І ці не плануецца ў будучыні пераход на адзіныя для ўсёй краіны расцэнкі?

— Сапраўды, тарыфы на сацыяльныя паслугі адрозніваюцца па абласцях, бо, паводле заканадаўства, такія тарыфы вызначаюцца аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам з улікам рэальных выдаткаў у кожным канкрэтным рэгіёне. Разам з тым: Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны праводзіцца пэўная работа з фінансавымі органамі на месцах з мэтай падтрымання расцэнак на гэтыя паслугі на сацыяльна нізкім узроўні. Так, у свой час намі былі накіраваны рэкамендацыі па разліку і вызначэнню тарыфаў.

— Між тым, не сакрэт, што ў работнікаў тэрытарыяльных цэнтраў — свае і не менш складаныя праблемы. Так, многія з іх у гарадах наракаюць на невысокія заробкі, а ў сельскай мясцовасці — на адсутнасць транспартных зносінаў. Як вырашыць гэтыя праблемы?

— Аклады сацыяльных работнікаў вызначаюцца на падставе Адзінай тарыфнай сеткі і, згодна з узроўнем адукацыі, кваліфікацыі, а таксама характару работы, вагаюцца ў межах 6—8 разрадаў. Пры гэтым, паводле ўмоў аплаты працы, вызначаных з лістапада 2004 года, для сацыяльных работнікаў прадугледжаны павышэнні тарыфнага акладу ў памеры 20 і павышэнні за стаж работы ў галіне — у памеры ад 10 да 30 працэнтаў. А 26 верасня 2006 года была прынятая пастанова міністэрства, якая вызначае павелічэнне памераў павышэння тарыфных ставак ці акладаў за характар і ўмовы працы сацыяльных работнікаў, з 20 да 30 працэнтаў. І парадак устанаўлення такіх павышэнняў распрацоўваецца зараз.

Што ж да транспартных зносінаў, то варыянтам вырашэння гэтай праблемы для сацыяльных работнікаў, якія абслугоўваюць жыхароў вёскі, з'яўляецца забеспячэнне веласіпедамі. Апроч таго, прадугледжана, што сацыяльныя работнікі і медыцынскія сёстры тэрытарыяльных цэнтраў павінны забяспечвацца сродкамі індывідуальнай абароны, а самі цэнтры — мець легкавыя аўтамабілі. Прычым падкрэслю: паколькі дзейнасць тэрытарыяльных цэнтраў фінансуецца з мясцовых бюджэтаў, то і неабходныя асігнаванні на гэтыя мэты павінны прадугледжвацца менавіта ў мясцовых бюджэтах.

— І апошняе. Давайце нагадаем, калі было ўстаноўлена само свята — Дзень работніка сацыяльнай абароны? І колькі чалавек лічыць яго прафесійным святам?

— Увогуле, датай «нараджэння» сістэмы сацыяльнай абароны лічыцца 5 студзеня 1919 года, калі пастановай Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі быў створаны Камісарыят сацыяльнага забеспячэння. А само прафесійнае свята, Дзень работніка сацыяльнай абароны, было ўстаноўлена ўказам кіраўніка дзяржавы ад 29 мая 1997 года.

Зараз у сістэме Міністэрства працы і сацыяльнай абароны працуе каля 32 тысяч спецыялістаў. Пры гэтым непасрэдна ў сферы сацыяльнага абслугоўвання занята амаль 26 тысяч, і ў тым ліку ў нас налічваецца больш за 12 тысяч непасрэдна сацыяльных работнікаў аддзяленняў сацыяльнай дапамогі на даму. Пры гэтым у сучасных умовах сацыяльная работа — не проста прафесійны занятак, а лад жыцця. Таму працаваць у сацыяльнай сферы сёння — значыць, валодаць цярпеннем, вытрымкай, дабрынёй, быць сумленным і любіць людзей. Усе гэтыя якасці ў поўнай меры ўласцівыя работнікам нашай сістэмы. Кожны з іх штодня робіць высакародную справу — дапамагае старым, малазабяспечаным, інвалідам. А ў рэшце рэшт ад гэтага шмат у чым залежыць вера людзей у сацыяльную справядлівасць, у здольнасць дзяржаўных структур абараніць іх правы і інтарэсы. Вось чаму, карыстаючыся выпадкам, хачу праз «Звязду» павіншаваць усіх спецыялістаў нашай сістэмы з прафесійным святам — Днём работніка сацыяльнай абароны. І пажадаць ім здароўя, сямейнага дабрабыту і творчых поспехаў.

Сяргей ГРЫБ.

Шайбу, шайбу!

Натхненне ад Захарава

Перад дэбютам «Юнацтва» ў фінале Кантынентальнага кубка трэнер мінчан стаў лепшым іграком матча з украінцамі

У час цырыманіі адкрыцця III Каляднага Міжнароднага турніру аматараў хакей на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што балельшчыкі даўно назвалі гэтыя спаборніцтвы неафіцыйным чэмпіянатам свету сярод аматарскіх каманд: «Калі на першы і другі турнір прыязджала па 8 каманд, то зараз 12 з Еўропы, Азіі, Паўночнай Амерыкі». Прэзідэнт выказаў спадзяванне, што і сёлета гледачы ацэняць майстэрства ігракоў.

У першы дзень спаборніцтваў расіяне разграмілі славакаў (група «С») — 8:1, чэхі — казахстанцаў (група «В») — 9:2, а аўстрыйцы — немцаў (група «D») — 7:2. Аднак з самым буйным лікам завяршылася сустрэча гаспадароў і ўкраінцаў. Каманда Прэзідэнта Беларусі вельмі засмуціла сапернікаў — 12:1, прычым госці змаглі закінуць шайбу ў беларускія вароты толькі ў канцы трэцяга перыяду (варатар Леанід Фацікаў адбіў два буліты, выдатна абараняў «рамку» і Аляксандр Гаўрылёнак). Цікава, што лік у гэтым матчы адкрыў Павел Белы, які стаў аўтарам першай шайбы ў час гульні ў новенькім лядовым палацы «Металург» у Жлобіне, калі каманда Прэзідэнта спаборнічала з ветэранамі Гомельшчыны. Дарэчы, у паядынку з украінцамі Павел Белы закінуў чатыры шайбы. Таксама вызначыліся Андрэй Асташэвіч, Вадзім Бекбулатаў, Міхаіл Захараў, Юрый Курбыка, Алег Антоненка. Прэзідэнт краіны зрабіў галявую перадачу і дапамог аформіць канчатковы разгромны лік 12:1. Дарэчы, лепшым іграком у матчы стаў Міхаіл Захараў, трэнер мінскага клуба «Юнацтва». Сёння каманда Прэзідэнта памераецца сіламі са швейцарцамі.

Гульня, якую аматарскія дружыны дэманструюць на Каляднym турніры, ніяк не паўплывае на відовішчнасць матчаў: колькасць галоў у кожнай гульні ў параўнанне з сустрэчамі не тое што чэмпіянату Беларусі, але і першынства свету, больш вялікая. Такі шайбавы бум, зразумела, радуе вока балельшчыкаў, асабліва калі атакуе іх каманда. Сакрэт жа гэтага вельмі просты: матчы праходзяць па так званых ветэранскіх правілах (без грубай барацьбы), замест выдаленняў выконваецца буліт, а хакейны пенальці па эмоцыях нічым не ўступае футбольнаму адзінаццаціметроваму.

Ірына ПРЫМАК.

МАБІЛЬНАЯ АСТРАЛОГІЯ

У беларускіх аўтааматараў з'явілася магчымасць перад выездам у дарогу параіцца з зоркамі па «мабільніку».

Як паведаміла «Звяздзе» начальнік аддзялення ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС краіны Ганна Банадык, кампанія «Стрымлайн» падтрымала і ажыццявіла ідэю аператыўна знаёміць абанентаў VELCOM, МТС і DIALLOG з астралагічнымі прагнозамі для вадзіцеляў. Адмысловыя рубрыкі прапануюць мабільныя сэрвісы MMS-ІНФА 515 і SMS-ІНФА 511. Для таго, каб атрымаць аўтагараскоп, трэба накіраваць запыт GORO GAI альбо ГОРО ГАИ адпаведна на нумары 515 ці 511. Кошт аднаго запыту на нумар 511 і 515 для абанентаў VELCOM складае адпаведна 110 і 600 рублёў, для кліентаў МТС — 125 і 570 рублёў. Карыстальнікі паслуг DIALLOG могуць атрымаць гараскоп толькі пасля запыту на нумар 511 і гэта абыдзецца ім у 120 рублёў.

Варта адзначыць, што ў сэрвісе MMS-ІНФА 515 ёсць таксама рубрыка «Правілы дарожнага руху», дзе можна знайсці і атрымаць у выглядзе MMS-паведамленняў пытанні з экзаменацыйных білетаў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ДТЗ З... КРАДЗЯЖОМ

Для аршанца, які трапіў у дарожна-транспартнае здарэнне, гэты дзень стаў па-сапраўднаму «чорным»: мала таго, што машына апынулася ў кюветце, яго яшчэ і абакралі.

Здарэнне адбылося на дарозе Брэст— Мінск—мяжа РФ паблізу вёскі Палявая Смалявіцкага раёна. Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, жыхар Оршы тут трапіў у ДТЗ і на час пакінуў аўто. Што і скарыстаў невядомы зладзюжка, які міма «прабягаў». З аўтамабіля «гаспадарлівы» чужак забраў 3 тысячы долараў ЗША і 4 мільёны рублёў. Пабагацеўшага «прыхватызатара» вышукваюе міліцыя.

Ігар ГРЫШЫН.

5 студзеня

Дзве даты

100 гадоў назад (1907 год) нарадзіўся Кастусь Губарэвіч, беларускі драматург, заслужаны дзеяч мастацтваў. Паводле яго сцэнарыяў на «Беларусьфільме» пастаўлены вядомыя кінакарціны «Дзяўчынка шукае бацьку» (1959), «Анюціна дарога» (1968), «Паланез Агінскага» (1971), за якія ў 1972 годзе аўтару была прысуджана Дзяржаўная прэмія Беларусі ў галіне кінематаграфіі. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.



1894 год — малады юрыст Уладзімір Ульянаў напісаў сваю першую палітычную лістоўку («Да рабочых Семяннікаўскага завода»).

Цытата дня:

«Калі хто-небудзь ліжа табе падэшвы, прыцісні яго нагой, перш чым ён пачне кусацца».

Поль Валеры (1871—1945), французскі пісьменнік.

Прамая лінія

ДАПАМАЖЫЦЕ ПАЗВАНОЧНІКУ

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Дыскагенныя радыкуліты, астэахандрозы, розныя захворванні дробных суставаў пазваночніка — у апошні час гэтыя хваробы сталі праблемай стагоддзя. Ад боляў у паясніцы і спіне церпіць амаль палова насельніцтва планеты. А калі ўзяць узрост 50—60 гадоў, дык і ўсе 80 працэнтаў. Хвароба развіваецца часцей за ўсё так: дзесьці пасля 25 гадоў чалавек адчувае боль у пазваночніку, які пасля 40 гадоў турбуе ўсё часцей. А між тым хваробе не знікла, а «затаілася». Таму вельмі важна паставіць ранні дыягназ, накіраваць сілы на прафілактыку захворвання. І сучаснай медыцыне гэта цалкам пад сілу. Напрыклад, яшчэ не так даўно дыягназ «дыскагенны радыкуліт» укладваў хворага ў ложак на 2—3 тыдні. Цяпер жа пацыент ходзіць назаўтра. І гэта дзякуючы новым аперацыйным методыкам, аўтарам якіх з'яўляецца загадчык нейрахірургічнага аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, доктар медыцынскіх навук, прафесар Арнольд Фёдаравіч СМЕЯНОВІЧ. Ён прыняў удзел у «прамой лініі» «Звязды» — адказаў на пытанні, што паступілі ў рэдакцыю, адносна хвароб пазваночніка.

☎ — Добры дзень. Я званю з Лепельскага раёна. Мне 21 год. У мяне — астэахандроз грудnога аддзела пазваночніка, а таксама грыжа Шморля. Пастаянна пакутую ад болю ў спіне. Якое лячэнне дапаможа пазбавіцца ад іх?

— Астэахандроз не такое ўжо і страшнае захворванне, хоць сустракаецца даволі часта. Пры ім трэба праводзіць кансерватыўнае лячэнне. Акрамя таго грыжа Шморля — ускладненне міжпазванковага храшча ў цела пазванка — таксама можа даваць боль. Вам трэба звярнуцца да неўролага па месцы жыхарства, які прызначыць комплекснае лячэнне. Яно можа ўключаць і масаж, і фізіяпрацэдуры, і магнітатэрапію, і лазератэрапію. Карацей кажучы, усе віды лячэння, якія існуюць пры гэтым захворванні і якія могуць вам дапамагчы.

— Але ў Лепелі няма неўролага.

— Тады вам трэба папрасіць накіраванне да спецыялістаў у Віцебск ці ў наш Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр, які знаходзіцца ў Мінску па вуліцы Ф. Скарыны, 24. Там вас пракансультуюць неўролаг і нейрахірург. І прызначаць лячэнне.

☎ — Мяне завуць Марыя Філімонаўна. Тэлефаную са Жлобіна. Мой дыягназ — правабакоўскаліёз пазваночніка. Магчыма ад гэтага ў мяне вельмі баляць суставы рук і ног.

— Зразумела. Скрыўленне пазваночніка дае перагрузку на мышцы, таму ў вас болі могуць узмацняцца. Але гэта артапедычная праблема, якая патрабуе адпаведнага лячэння. Вам трэба звярнуцца да артапеда-траўматолага. Спачатку да спецыяліста па месцы жыхарства. Калі ж лячэнне не дапаможа, прасіце накіраванне ў Гомельскую абласную бальніцу. Там працуе вельмі добры ўрач — загадчык кафедры артапедыі і траўматалогіі Гомельскага медуніверсітэта, прафесар Дзятлаў. Я б параіў пракансультавацца ў яго.

☎ — У майго сына — грыжа пазваночніка. Гэта пацвердзіў здымак. Апошнім часам сыну становіцца ўсё горш. Не знікаюць болі ў назе. Ніякае лячэнне не дапамагае. Званю з Глыбокага.

— Калі на здымку ўстаноўлена міжпазванковая грыжа і ёсць клінічныя праявы хваробы, боль у назе ніжэй калена працяглы час, то трэба рабіць аперацыю. Аперыравацца можна ў нейрахірургічным аддзяленні Віцебскай абласной бальніцы ці бярыце накіраванне ў наш цэнтр.

☎ — Добры дзень, я з Гомельскай вобласці. У 1999 годзе мне быў пастаўлены дыягназ — грыжа пазваночніка і вызначана група інваліднасці. Зараз групу знялі. Але я адчуваю сябе вельмі дрэнна, болі працягваюцца, нямее нага. Кансерватыўнае лячэнне не дапамагае, урачы рэкамендуюць рабіць аперацыю. Ці абавязкова гэта?

— У вашай сітуацыі, калі ёсць міжпазванковая грыжа, маецца боль у назе і не дапамагае кансерватыўнае лячэнне, магчыма і трэба будзе рабіць аперацыю. Зразумейце, група інваліднасці сама па сабе не лечыць хворага. Гэта толькі сацыяльнае паняцце. Група даецца толькі тады, калі ніякія метады лячэння хвораму не дапамагаюць. Калі ж ёсць магчымасць вылечыцца, як вам раяць, пры дапамозе аперацыі, трэба прыслухацца да думкі спецыялістаў.

☎ — Званю з Глыбокага. Мне 32 гады. У мяне — пастаянныя болі ў пазваночніку, баляць ногі, лячэнне не дапамагае.

— Вам рабілі камп'ютарную тамаграфію пазваночніка?

— Не.

— А чаму ваш неўролаг не накіроўвае на такое даследаванне ў Віцебск? Ён абавязаны гэта зрабіць, калі лячэнне не дапамагае.

— І яшчэ. У мяне астэахандроз шыйнага аддзела пазваночніка...

— Гэта паталогія патрабуе кансерватыўнага лячэння. Але ў вашым узросце захворванне пачало развівацца вельмі рана. Вам трэба правесці даследаванне ў раённым ці абласным цэнтры. Трэба, каб вас паглядзеў нейрахірург. Магчыма, высветліцца, што хвароба мае нейрахірургічны профіль, а не неўралагічны.

☎ — Турбуе Аляксей Рыгоравіч з Буда-Кашалёва. Два гады таму я ўпаў з колаў, і ў мяне пачаліся моцныя болі ў спіне і плячах. Нядаўна быў на прыёме ў Гомелі ў артапеда. Ён паставіў дыягназ — астэахандроз пераснічна-крыжавога і ніжнегрудnога аддзела пазваночніка. Прымаў дыклафенак, капсікам. Болі не праходзяць. Што мне рабіць?

— Скажыце, калі ласка, акрамя болю ў спіне, грудной клеткі, болі ў нагах ёсць?

— Пабольваюць, але не моцна.

— Вам трэба звярнуцца да свайго неўролага, які прызначыць лячэнне. Хутчэй за ўсё вам не патрэбна нейрахірургічная дапамога. Калі ж лячэнне не будзе эфектыўным, раю пракансультавацца ў Гомелі, дзе вас паглядзяць адначасова і неўролаг, і нейрахірург і дадуць рэкамендацыі.

— Добры дзень, доктар. Мяне завуць Юрый, званю з Асіповічаў. Мне 42 гады. Вось ужо гадоў шэсць хварэю на дыскагенны радыкуліт, адчуваю моцныя болі, асабліва баліць нага ў ніжняй частцы ззаду.

— Думаецца, у вас выпадзенне міжпазванковага дыска L5, S1. Вам трэба зрабіць камп'ютарную ці магнітна-рэзанансную тамаграфію пазваночніка і абавязкова пракансультавацца ў спецыялістаў, яны падкажуць, што рабіць. Гэта можна зрабіць і ў нашым цэнтры.

☎ — Ганна Сцяпанаўна з Асіповіцкага раёна. Вельмі баліць паясніца, бываюць болі ў нагах.

— Боль у нагах пастаянны ці не?

— Не.

— Я хачу вам сказаць, што боль у паясніцы ўказвае хутчэй за ўсё на астэахандроз. І вам трэба пракансультавацца ў неўролага, а не ў нейрахірурга.

«Прамую лінію» правялі Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.

(Працяг будзе.)

Погляд

АПАЗІЦЫЯ ЦІСНЕ НА ГАЗ

Айчыннай псеўдаапазіцыі не прывыкаць зарабляць палітычныя дывідэнды на ўласна беларусах. Чым больш цяжкасцяў і праблем, чым горш даводзіцца народу, тым больш радасці і дрэнна схаванай надзеі ў вачах усемагчымых «адзіных», «найбольш адзіных» і «адзіна адзіных». Натуральна, што калі б асобныя «бацькі» беларускай дэмакратыі» не скарысталіся напружанай сітуацыяй вакол паставак энерганосьбітаў у Беларусь, іх «добрыя мулаты» за акінам проста перасталі б іх паважаць...

Зарыпелі пер'і, і, быццам у крывым люстэрку, прынцыповая пазіцыя кіраўніцтва Беларусі па адстойванню нацыянальных інтарэсаў у газавых перамовах ператварылася ў... жаданне «загнаць» беларусаў у землянкі. Прыём выдаваць жаданае за рэчаіснасць даўно ў пашане ў мясцовых «дэмакратызатараў». Яно і зразумела, з зямлянак весці людзей да «светлай будучыні» куды больш зручна. А вось не давесці да тых самых зямлянак, захаваць дабрабыт беларусаў задача куды больш складаная і айчыннай апазіцыі не па зубах.

Дасталося «на арэхі» і «імперскай Расіі». Ну што тут сказаць — самі вінаватыя. Недальнабачныя і недружалюбныя крокі ў адносінах да бліжэйшага саюзніка, натуральна, будуць выкарыстаны нядобразычліўцамі Саюзнай дзяржавы ды і самой Расійскай Федэрацыі. Калі апошняя ТАК паводзіць сябе з партнёрамі і саюзнікамі, на што разлічваць іншым? Беларуская апазіцыя ўжо не саромеючыся прадстаўляе рускіх як акупантаў. Пакуль эканамічных. І прама называе суседнія еўрапейскія народы, якія далі прытулак базам НАТО, «братнімі». Што пасееш...

Далей — больш. У новым патрыятычным уradзе, патрабуюць апазіцыянеры, нават не павінна быць людзей, якія мелі справы з расійскімі імперыялістамі. І тут зноў улюбёная нотка з намёкам на сябе: патрэбны не прафесіяналы, а сапраўдныя патрыёты. Сумніўная альтэрнатыва...

Якое ж выйсце з сітуацыі, якая склалася, бачыцца незапатрабаваным правадырам? А нічога новага — усё тое ж летуценнае «Захад нам дапаможа!»

Ужо дапамагае. Эканамічнымі санкцыямі і пазбаўленнем прэферэнцыі у гандлі, што ў выніку, зноў-такі б'е па дабрабыту беларускага народа.

Уладзімір АЛЯКСАНДРАЎ.

ЗАБРАЎ З КАСЫ 2 МІЛЬЁНЫ

Перад святам Новага года ў Оршы з магазіна злодзей выкраў 2 мільёны беларускіх рублёў. Калі потым даваў паказанні ў міліцыі, адзначыў, што ў магазіне на той момант нікога з гандляроў чамусьці не было. Перад законам будзе адказваць беспрацоўны жыхар Мінска 1988 года нараджэння.

СКАЧОК З 5-ГА ПАВЕРХА

У Віцебску 1 студзеня 22-гадовы хлопец і дзесяцікласніца адной са школ упалі з балкона 5-га паверха. Як сведчыць міліцэйская зводка, скачок адбыўся «па неасцярожнасці».

Трагедыя адбылася на вуліцы «Генерала Белабародава». Пацярпелыя былі шпіталізаваны. Хлопец, на жаль, памёр. А яго сяброўка на час фіксавання выпадку была жывая. Вядзецца следства.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Суд Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці ў сувязі з заявай аб прызнанні адсутным без вестак ***Шчуро Юрыя Вячаслававіча***, 05.09.1964 года нараджэння, ураджэнца в. Вача Сегежскага раёна Карэльскай АР, які ў 2000 г. выехаў на заробкі і да сённяшняга дня месца яго жыхарства невядомае, просіць усіх грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць аб ім звесткі, паведаміць іх суду на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Згубленую пячатку на імя ўрача Зяновіч Святланы Генрыхаўны лічыць несапраўднай.

КУП «Агросвязьсервис», г. Молодечно (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводят открытый аукцион по продаже следующего имущества:

| № лота | Наименование имущества | Год выпуска | Начальная цена (снижена на 20%) с НДС в бел

ПАНЯДЗЕЛАК, 8 СТУДЗЕНЯ

6.10, 16.55 Серыял «Усё змяшалася ў доме...».
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.45 Навіны.
7.05, 7.35, 8.10, 8.35 «Добрай раніцы, Беларусь!».
7.30, 8.30, 11.50 «Дзелавое жыццё».
9.05 Серыял «Заўсёды гавары «заўсёды»-2. Заключная серыя.
10.00 «Панарама тыдня».
11.20 «Існасць».
12.15 І. Смактуноўскі і А. Яфрэмаў у камедыі «Сцеражыся аўтамабіля».
13.50 «Сузор'е надзей».
14.30 «Вакол планеты».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Мультфільмы.
15.55 «Культурныя людзі».
16.20 «Кухня гумару».
17.50 Серыял «Каханне як каханне».
18.55, 0.05 «Зона Х».
19.35 «Час спорту».
20.00 Серыял «Заўсёды гавары «заўсёды»-3. 1-я серыя.
Заспеўшы аднойчы мужа з палюбоўніцай, Вольга падае на развод. Яна забірае дзяцей і сыходзіць ад яго. Пасобку былым мужу і жонцы давядзецца перажыць нямала непрыемнасцяў.
21.00 «Панарама».
21.40 Урачыстае ўручэнне прэмій «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтваў.

7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00 Нашы навіны.
7.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.05 «Вінакур і Лешчанка. Гісторыя адной дружбы». Дак. фільм.
11.05, 21.05 Серыял «Не радзіся прыгожай».
11.50 «Бесталковыя нататкі».
12.05 Пакуль усе дома.
13.05 Серыял «Сабачая справа». 1-я серыя.
14.05 Фігурнае катанне. Чэмпіянат Расіі. Паказальныя выступленні.
15.05 «Златые горы» Лідзіі Русланавай.
16.10 Музычны фільм «За двума зайцамі».

Гратэскавая камедыя становішчаў па матывах аднайменнай п'есы Міхаіла Старыцкага.
18.15, 21.00, 23.15 Навіны спорту.
18.20 «Смешныя людзі».
19.00 Серыял «Талісман».
20.00 Час.
22.00 Серыял «Сёстры па крыві».
23.20 «Іронія лёсу Барбары Брыльскай».
0.15 «Аўтаралі Лісабон—Дакар 2007».

7.00 «Ранішняя падзарадка».
8.00, 17.35 Серыял «Салодкі плод».
9.00, 16.00 Навіны культуры.
9.10 «У гэты дзень».
9.15, 18.35 Серыял «Талісман кахання».
10.10, 19.30 Серыял «Прыіск».
11.10 «Сезон у дачы».
11.40 «Плошча мастацтваў».
12.05 «Тэлебарометр».
12.20 «Класны ўрок».
12.35 «Добрыя навіны».
13.05 «Вас выклікае Спартландыя».
13.45 Меладрама «Пяшчотная зіма». 1-я і 2-я серыі.
16.10 Серыял «Школа першых ракетак-2».
16.35 «Класны ўрок».
16.50 «Ядзім дома».
17.15 «Анекдот. LAD».
20.30 «Калыханка».
20.45 «Беларуская часінка».
21.35 Дак. фільм «Тайны Даліны Цароў».
22.30 «Хакей. Формула гульні».
22.55 Баявік «Онг Бак».

6.05, 17.20 «Міншчына».
6.15 «З чаго пачынаецца раніца».
7.30 «Тыдзень» з Аленай Хадаронак.
8.45 «Вялікае снеданне».
9.20 «Народжаныя ў СССР».
10.00 «Голы кухар».
10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
10.40 «Дзеля смеху».
11.00 «Гадзіна суда: справы сямейныя».
12.00 «Гадзіна суда».
13.00 «Ёсць кантакт».
13.50 Прыгодніцкі фільм «Зверабой».
Па матывах аднайменнага рамана Дж. Ф. Купера.
16.50 «Культурнае жыццё».
17.30 «Званая вячэра».
18.25 Серыял «Пяць мінут да метро».
20.05 «СТБ-спорт».
20.20 «Добры вечар, малыш».
20.30 «Добро пожаловаться».
20.50 «Салдаты 6». Серыял.
22.00 «Рэпарцёр СТБ». Рэфлекс жыцця.
22.55 «Студэнты». Серыял.
23.45 Маст. фільм «Капальні цара Саламона».
2.30 «Для паўночнікаў — Sounds of Style».

5.50 Зараджайся!
7.20, 13.25 Серыял «Чалавек мора».
8.10, 16.10, 20.55 Студыя 60—90.
8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30 «Навіны Садружнасці».
8.45 Калядныя пернікі.
9.00, 16.40 Дак. серыял «За сталом з Бертам Волфам».
9.30, 19.10 Маст. фільм «На цёмным баку месяца».
11.00, 14.50 Дак. серыял «Самыя прыгожыя дамы свету».
11.50, 17.55 Ток-шоу: Спрэчная тэрыторыя.
13.00, 15.30 Мультфільм.
15.45 Дзіцячы сеанс «Экхарт».
16.15 Дзеці сонца.
17.15 Акцэнты.
18.55 «Цік-так».
21.00 Маст. фільм «Да заўтра».
22.30 Казахстан: старонкі гісторыі.
22.45 Акцэнты+.
23.05 Серыял «Кароль граху».

8 канал

7.00, 19.40 «Сад і агарод».
7.05, 9.55, 21.05, 23.00 «Метэапрагноз».
7.10 Маст. фільм «Віктарыя і Альберт».
8.45 «Топ-8».
9.00 «Дом жывых гісторый».
9.30 «Адшукваецца адпачынак».
9.50, 21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
10.00 «Зоркі еўрапейскага кіно».
11.45 «Тэлечат — «8 канал».
16.30 Мультпарад.
16.40 «К-відэа для дзяцей».
17.00 Маст. фільм «Звычайны цуд».
19.35, 21.10 «Навіны кіно».
19.45 Серыял «Двайны агент».
20.45 «Вечарніца».
21.15 Дэтэктыў «Дэтаксікацыя».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
7.45 «Нона Мардзюкова. Я ўспамінаю...».
8.45, 12.45, 18.40 Весткі. Дзяжурная часць.
9.00 Серыял «Тайны следства».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.30, 13.20, 16.20, 19.45 Мясцовы час. Весткі—Масква.
10.50, 21.20 Серыял «Доктар Вегас».
11.50 «Прыватнае жыццё». Ток-шоу.
13.40 Суд ідзе.
15.00 Серыял «Ад'ютанты кахання».
16.40 Серыял «Асуджаная стаць зоркай».
17.40 Серыял «Ваўчыха».
20.05 Спакойнай ночы, малышы!
20.15 Серыял «Тайны следства-2». 1-я серыя.
22.15 «Першыя на Марсе. Няспетая песня Сяргея Каралёва».
21.00 Баявік «Абсалон».
22.45 Драма «Балада пра Джэка і Розу».
0.40 Маст. фільм «Прыхіндзіяда, або Бег на месцы».

10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
10.20 «Кватэрнае пытанне».
11.20 Камедыя «Цудоўная чацвёрка».
13.20 Шоу «Песні года».
14.45 Маст. фільм «Паводле даных крымінальнага вышуку».
16.20 «Іх норавы».
16.55 Драма «Развітанне».
19.35 Серыял «Доктар Жывага».
20.40 Драма «Капейка».

Удалыя прыгоды ВАЗ-2101, «Жыгулі» першай мадэлі, легендарнай «капейкі».
22.50 Канцэртная праграма «Сябры сустракаюцца зноў».

5.10 «Карчма на Пятніцкай». Дэтэктыў.
6.35 «Дзікія лебедзі». Мультфільм.
7.30 «Калядныя гісторыі». Маст. фільм.
8.00 Ключавы момант.
8.45 «Рэпарцёр».
9.00 На дачы.
9.30 Нашы любімыя жывёлы.
10.00 «Кацяня з вуліцы Лізюкова». Мультфільм.
10.10 «Музычная гісторыя». Алена Свірыдава.
10.45, 13.45, 19.45, 21.55 Падзеі.
11.05 «Куды вядзе нас Пятачок?». Навагодні рэпартаж.
11.30 Камедыя «Гараж».
13.15 Сяргей Бязрукаў у праграме «Запрашае Барыс Ноткін».
14.00 «Капрызная прынцэса». Мультфільм.
14.25, 4.00 «Паляўнічыя на раўнінах». «Жывая прырода».
15.15 Дак. фільм «Засакрэчанае каханне». «Я заняты, у мяне ёлкі».
16.00 «Эх, разгуляй!». Фестываль зорак шансона.
18.10 Баявік «Гадзіннікавы механізм».
20.05 Маст. фільм «Весьягонская ваўчыха».
22.10 «Тэатр Марыны Нявёлавай».
22.50 Маст. фільм «Слова для абароны».
0.25 Маст. фільм «Мэверык».
2.30 Камедыя «Няўдачнік Альфрэд, або Пасля дажджу кепскае надвор'е».
Няшчасці праследавалі яго на кожным кроку. Ён спрабаваў скончыць самагубствам, але і гэта яму не ўдалося. Затое ён сустрэў юную тэлезорку.

9.30, 12.30, 23.00, 1.45 Ралі рэйд. Дакар.
10.00, 14.00, 18.00 Біятлон. Кубак свету ў Германіі.
11.00, 16.30 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету ў Аўстрыі.
13.00 Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Італіі.
15.00, 22.00 Дартс. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі.
19.00 Вось гэта дзіва!!!
19.30, 23.45 Футбол. Еўрагалы.
20.00, 0.15 Футбол. Кубак «Эфес Пілсен» у Турцыі.
1.15 Вось гэта дзіва!!!

ФІЛЬМ ДНЯ

«РАСІЯ» 22.45 «БАЛАДА ПРА ДЖЭКА І РОЗУ» (ЗША, 2005 Г.)

Джэк — натхнёны альтруіст, які ўлюбёны ў прыроду і вельмі любіць сваю дачку. Ён усімі сіламі стараецца адмежаваць кволую Роўз ад тлятворнага ўплыву знешняга свету. Але яе дапытлівая натура імкнецца вырвацца з цеснага мікрасвету, створанага бацькам. Раптоўна Джэк разумее, што смяротна хворы, і вырашае, што яму трэба паказаць дачцэ рэальны свет і навучыць яе зносінам з людзьмі. Але вельмі позна.

Рэжысёр — Рэбека Мілер. **У ролях:** Дэніэль Дэй-Льюіс, Кэтрын Кінер, Каміла Бель.

АЎТОРАК, 9 СТУДЗЕНЯ

6.10, 16.50 Серыял «Усё змяшалася ў доме...».
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 20.55 Навіны.
7.05, 9.05 Прэс-агляд.
7.10, 7.35, 8.10, 8.35 «Добрай раніцы, Беларусь!».
7.30, 8.30 «Дзелавое жыццё».
9.10, 20.00 Серыял «Заўсёды гавары «заўсёды»-3.
10.00 «КампаС».
10.30, 17.50 Серыял «Каханне як каханне».
11.30, 21.45 «Эпоха». Марк Шагал.
12.10 «Час спорту».
12.30 Меладрама «Кур'ер».
14.00 Дак. серыял «Калейдаскоп цудаў».
14.30 «Раўнавага: асяроддзе пражывання».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Мультфільмы.
16.00, 0.45 Серыял «Дарагая Маша Бярэзіна».
18.50, 0.40 «Зона Х».
19.35 «Зямельнае пытанне».
21.00 «Панарама».
22.10 Баявік «Асінае гняздо».

Элітная група паліцэйскага спецназа атрымлівае заданне транспартаваць албанскага мафіёзі. Ім наладжваюць засаду.
0.30 Дзень спорту.

7.00 «Наша раніца».
8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00 Нашы навіны.
9.05, 19.00 Серыял «Талісман».
9.55, 22.00 Серыял «Сёстры па крыві».
10.45 «Ералаш».
11.00, 21.05 Серыял «Не радзіся прыгожай».
12.00 «Малахаў+».
13.05 Серыял «Сабачая справа».
14.05 «Кантрольная закупка».
14.35 «Дэтэктывы».
15.05 «Лаліта. Без комплексаў».
16.10 «Зоркі на лёдзе». Гала-канцэрт.
18.15, 21.00, 23.15 Навіны спорту.
18.20 Па-за законам «Дракула».
20.00 Час.
